ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

2 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 103 (28213) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Эх, маладая!.. «Круглы стол» у «ЧЗ»**



**На выпускны — ніякіх міні і макасінаў**



**Студатрады пашыраюць геаграфію**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый ВАКУЛЬЧЫК, старшыня КДБ:**

*«Сёння свет ушчыльную сутыкнуўся з новай разнавіднасцю глабальнай тэрарыстычнай пагрозы — кібертэрарызмам. Выкарыстанне ў тэрарыстычных мэтах лічбавых тэхналогій разам з бязмежнымі магчымасцямі інтэрнэту вымушае нас быць у гатоўнасці адэкватна рэагаваць на гэтыя выклікі. Кібертэрарызм, як ніякая іншая форма тэрарызму, носіць трансгранічны характар. Той ці іншы важны аб'ект можа быць падвергнуты атацы з любой кропкі планеты. Гэта істотна абцяжарвае работу па выяўленні і папярэджанні такіх злачынстваў і патрабуе ад спецслужбаў новых сумесных падыходаў да спынення такога віду тэрарыстычнай дзейнасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19877,00 | ▲ |
| Еўра | 22140,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 298,28 | ▼ |
| Укр. грыўня | 792,70 | ▲ |

# ХЛЕБ І ПЕСНЯ



Вольга РАБЦЭВІЧ, жыхарка вёскі Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна, пераняла сакрэты выпечкі хлеба і пірагоў ад сваёй матулі — лепшай гаспадыні ў гэтай палескай вёсцы. А яшчэ яе матуля Соф'я Мікалаеўна стварыла знакаміты фальклорна-этнаграфічны гурт «Завіца». Ад яе, акрамя адметных рэцэптаў палескай кухні, Вольга пераняла і народна-бытавыя песні і абрады.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Рынак працы

## Мяшаць бетон — не дамская справа

**Жанчынам важны абедзенны перапынак, а мужчынам — магчымасць зарабляць**

**Беларускім мужчынам плацяць больш, чым жанчынам — гэта факт. У сярэднім дамы зарабляюць на 23 працэнты менш. Кажуць, прычына ў розніцы сфер працы: жанчыны проста выбіраюць прафесіі, дзе аплата ніжэйшая. Але чаму так адбываецца? На якія крытэрыі звяртаюць увагу пры пошуку працы мужчыны і жанчыны? І чаму дамы часцей згаджаюцца на нізкааплатныя месцы?**

### Надбаўка за камандзіроўкі і адказнасць

Паводзіны мужчын і жанчын на рынку працы адрозніваюцца. Калі для першых пры выбары вакансіі важны матэрыяльны бок пытання, то для другіх — камфортныя ўмовы.

— Для жанчын мае значэнне больш свабодны працоўны графік. Працэнтаў 70 хочуць сядзець у офісе і аддаюць перавагу нераз'язному характару работы. Прадстаўніцам прыгожага полу важна таксама наяўнасць абедзеннага перапынку: каб можна было па прадукты схадзіць ці вырашыць нейкія свае праблемы, — расказвае **дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Квадрат» Святлана КАРАСЦЯЛЁВА.**

Для мужчын пералічаныя моманты неабавязковыя. Яны гатовы разглядаць ненармаваны рабочы дзень: там, дзе ёсць магчымасць зарабляць грошы неабмежавана, беларусы будуць шчыраваць і па 24 гадзіны ў суткі. Часта мужчыны згаджаюцца на больш мабільную працу, з працяглымі камандзіроўкамі, паколькі менш займаюцца бытавымі праблемамі. Большасць прадстаўнікоў моцнага полу шукаюць высокія пасады і гатовы несці на сабе шмат абавязацельстваў, бо адказнасць заўсёды аплачваецца даражэй. Пры пошуку працы мужчыны, дарэчы, таксама вядуць сябе больш актыўна. Па інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, яны ўладкоўваюцца на новае месца ў сярэднім на дзевяць дзён хутчэй за жанчын.

Даследаванне па бюджэце часу, якое праводзіў Белстат сумесна з ААН, пацвярджае: мужчыны надаюць працы больш увагі, чым жанчыны. Непасрэдна на рабоце моцная палова праводзіць на 41 хвіліну больш. А ў вольны час штодзень адводзяць працоўным пытанням у сярэднім 12 хвілін, тады як дамы — толькі восем.

СТАР. 4

■ Разумныя грошы

## НА АДЛЕГЛАСЦІ ВЫЦЯГНУТАЙ РУКІ

Спецыялісты раяць нават у банках і крамах трымаць сваю картку ў полі зроку



**У першых матэрыялах рубрыкі мы пазнаёмілі чытачоў з пластыкавымі карткамі, а таксама з банкаматамі і іншымі прыладамі самаабслугоўвання. Сёння мы пагаворым аб беспраблемным атрыманні грашовых сродкаў у аддзяленні банка, а таксама аб выкарыстанні «пластыку» ў арганізацыях гандлю. У гэтым нам дапамагае пакрокавы дапаможнік, які быў распрацаваны Нацыянальным банкам краіны.**

### І ў «акенцы» не ўсе анёлы

Узяў наш чалавек картку і накіраваўся ў сваё банкаўскае аддзяленне, каб атрымаць наяўныя грошы ці аплаціць нешта. Так здарылася, што ў гэтай фінансавай установе банкаматы і інфакіёскі не працуюць або менавіта вашу аперацыю праз прыладу самаабслугоўвання правесці немагчыма. Тут трэба звяртацца да спецыяліста. Аддае наш кліент сваю картку ў акенца і адразу супакойваецца, бо лічыць што тут яму баяцца няма чаго. І гэта сапраўды так, калі наведвальнік банка будзе заўсёды прытрымлівацца рэкамендацый экспертаў Нацбанка.

Першае, на што трэба звярнуць увагу, — усе дзеянні работніка фінансавай установы менавіта з вашай карткай павінны адбывацца на вашых вачах. Нельга дазваляць супрацоўніку банка выходзіць разам з карткай у іншае памяшканне.

СТАР. 3

■ Дасягненні

# ПРАЦАВАЦЬ, НЕ ЧАКАЮЧЫ ЎЗНАГАРОДЫ

**Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў учора ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам працоўных калектываў. У першы дзень лета ўшаноўвалі дактароў, выкладчыкаў, навукоўцаў, сацыяльных работнікаў, дзяржаўных служачых, журналістаў, а таксама супрацоўнікаў мытні, і тых, хто задзейнічаны ў сферах прамысловасці, будаўніцтва і культуры.**

Сімвалічна, што ў Дзень абароны дзяцей узнагароды ўручылі сацыяльным работнікам. Пры гэтым прэм'ер-міністр адзначыў, што сённяшняя сацыяльная палітыка дзяржавы шмат у чым скіравана на падтрымку сем'яў: «Дзяржава захоўвае свае сацыяльныя абавязацельствы па падтрымцы сем'яў і дзяцей. У краіне забяспечаны рост памераў дапамог па доглядзе за дзецьмі, уведзены дадатковыя віды матэрыяльнай падтрымкі сем'яў, прадастаўляецца шырокі спектр сацыяльных паслуг. Сістэма падтрымкі шматдзетных сем'яў узмоцнена ўвядзеннем сямейнага капіталу».

Таксама былі ўручаны падзякі Прэзідэнта за забеспячэнне датэрміновага ўводу ў эксплуатацыю Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі. «Абсталяванне цэнтра дапамагае рабіць раннюю дыягностыку анкалагічных, неўралагічных і кардыялагічных захворванняў, прызначаць дакладную схему лячэння, выбіраючы лекі, якія падыдуць пацыенту лепш за ўсё», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Таксама ўзнагароды атрымалі і тыя, хто ўдзельнічаў у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, супрацоўнікі Аршанскага льнокамбіната, «Сельской газеты», Мінаблвыканкама, а таксама інстытутаў НАН Беларусі, Вялікага тэатра оперы і балета, «Беларусьфільма».

Сярод узнагароджаных — тэлевядучая Святлана Бароўская, якая працуе на тэлебачанні ўжо 25 гадоў — яна адзначана медалём Францыска Скарыны. «Паверце, я парадуюся толькі адзін дзень — сёння. Таму што гэта ўзнагарода — не лаўры, на якіх ляжаць. Трэба бегчы далей, бо ты можаш добра працаваць, быць паспяховым, але адна памылка — і ўсё зробленае сыдзе на «нішто», — кажа тэлевядучая. — Я заўжды, калі з'язджаю ў камандзіроўкі, якія добрыя ўмовы ў іх не былі б, сумую па Беларусі. Па паветры, па людзях, па нашых праблемах. Зараз я пасол добрай волі ААН па прафілактыцы ВІЧ/СНІД у нашай краіне».

Сяргей Міховіч, галоўны рэдактар «Сельской газеты», прызнаецца, што «недзе гэта ўзнагарода — аванс. Сёння я шчаслівы, удзячны сваім супрацоўнікам, але работа рэдакцыйнага гадзінніка не спыняецца. Таму мы будзем і надалей працаваць на ніве сельскай гаспадаркі, няхай і словамі, але імкнуцца дапамагчы ёй у развіцці».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## КУЛЬТУРНАЯ ВЁСКА — КУЛЬТУРНАЯ МОЛАДЗЬ

### На Міншчыне БРСМ правядзе абласны фестываль КВЗ

**3 чэрвеня ў Клецку ў раённым Цэнтры культуры адбудзецца абласны фестываль КВЗ сярод працуючай моладзі «Культурная вёска — культурная моладзь».**

«Абласны фестываль КВЗ адкрые летні сезон для моладзі, каб гэтак жа — весела, яскрава і, галоўнае, здарова — прайшлі самыя любімыя летнія месяцы нашых актывістаў», расказалі ў Мінскім абласным камітэце БРСМ, які з'яўляецца адным з арганізатараў мерапрыемства.

На сцэне сустрэнуцца дзесяць каманд з розных куткоў сталічнай вобласці, каб паспаборнічаць ва ўменні зірнуць на жыццё з гумарам. Памерацца сіламі ім давядзецца ў трох конкурсах: «Прывітанне», «Біятлон» і «Музычнае дамашняе заданне». Гумар, арыгінальнасць і глядацкія сімпатыі стануць вызначальнымі пры выбары пераможцы. Удзельнікі каманд — работнікі прадпрыемстваў і арганізацый Міншчыны. Каму з іх у прамым сэнсе слова ўсміхнецца ўдача, пакажуць вынікі конкурсаў і іх сумарны бал.

Упершыню фестываль КВЗ сярод працуючай моладзі сталічнай вобласці на Кубак кіраўніка прыстолічнага рэгіёна прайшоў у 2014 годзе. Мерапрыемства атрымала шырокі грамадскі рэзананс і праз год «прапісалася» на клецкай зямлі, дзе створаны дастойныя ўмовы для жыцця і творчасці моладзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Слова — дэлегату




# На першым плане — работа з насельніцтвам

**На Брэстчыне абралі 350 дэлегатаў пятага Усебеларускага народнага сходу. Прадстаўляць вобласць будуць людзі розных прафесій і ўзростаў з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, адметныя ў сваёй справе прафесіяналы. Адзін з іх — старшыня Гарадзецкага сельскага Савета Кобрынскага раёна Дзмітрый МІРОНЕНКА — працуе на сваёй пасадзе першае скліканне. Паводле слоў старшыні райсавета дэпутатаў Івана Даўжука, у яго даволі складаны ўчастак работы. 31 населены пункт уваходзіць у адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку. З Дзмітрыем Міроненкам наша сённяшняе інтэрв'ю.**

***— З якім настроем, якімі думкамі збіраецеся ўдзельнічаць ва ўсенародным форуме?***

— Па-першае, адчуваю гонар за давер, па-другое, усведамляю сваю адказнасць. Прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў збяруцца, каб падвесці вынікі мінулых пяці гадоў і выпрацаваць праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучую пяцігодку. І тую праграму, што будзе прынятая, нам давядзецца ўвасабляць у канкрэтныя справы і праекты. Вядома кожнаму з нас, гавару зараз найперш пра сельскіх жыхароў, хацелася б, каб палепшылася сітуацыя з занятасцю, каб зарплата стала большай, каб дарогі ўсюды асфальтаваліся і якасць жыцця расла па ўсіх кірунках. Але ж мы разумеем, што ўсе агучаныя пункты маюць рэальны кошт у грашовым выражэнні. Для паляпшэння як грамадскага, так і асабістага дабрабыту кожнага чалавека сродкі трэба зарабляць.

***— Ці ўдаецца гэта рабіць сельвыканкаму ў Гарадцы?***

— Пакуль пахваліцца вялікімі даходамі не выходзіць. Прыгарадныя сельскія Саветы зарабляюць продажам зямельных участкаў на аўкцыёнах і атрымліваюць дадатковыя магчымасці для добраўпарадкавання населеных пунктаў. Але думаю, што не за гарамі такі час і для нас. Напрыклад, у вёсцы Камень, што па дарозе з Кобрына на Гарадзец, ужо няма ніводнага пустога дома. Іх купляюць у асноўным гараджане. Паступова яны пачынаюць прыглядацца і да Гарадца. Наш населены пункт даволі перспектыўны, тут рознапланавая інфраструктура, ёсць чыгуначная станцыя, на добрай хуткасці па шашы за чвэрць гадзіны можна дабрацца ў райцэнтр. Так што ў будучым, думаю, і ў нашай мясцовасці зямельныя ўчасткі набудуць рэальны кошт.

***— Ці ёсць праблемы з занятасцю насельніцтва ў вёсках сельсавета?***

— Гэта найважнейшае пытанне для любога рэгіёна альбо населенага пункта. Ёсць у чалавека работа, значыць, накормленая яго сям'я, паступаюць падаткі ў бюджэт і знікаюць падставы для негатыўных з'яў, якія параджае беспрацоўе. На шчасце, у гэтым сэнсе ў нас асаблівых праблем няма. На тэрыторыі сельсавета функцыянуе два даволі паспяховыя прадпрыемствы — ААТ «Гарадзец Агра» і Грушаўскі рамонтна-механічны завод. У аграгарадку, як я ўжо казаў, маецца даволі шырокая сетка сацыяльных аб'ектаў, дзе працуе нямала людзей. У нас паспяхова развіваецца шэсць фермерскіх гаспадарак. Яны таксама наймаюць работнікаў. Некаторыя вяскоўцы выбралі занятак асабістай падсобнай гаспадаркай, трымаюць некалькі кароў, вырошчваюць сельгаспрадукцыю і тым самым прыстойна ўтрымліваюць сем'і. Невялікая частка адносна маладых людзей ездзіць на работу ў горад. Графік руху цягнікоў гэта дазваляе. Такім чынам, з дзвюх тысяч чалавек працаздольнага ўзросту сёння не працуе каля аднаго працэнта. Думаю: хто хоча працаваць, той можа знайсці такую магчымасць. Нават калі не ўдаецца знайсці працу з графікам ад васьмі да сямнаццаці, можна ўзяць прыклад з суседзяў і заняцца падсобнай гаспадаркай. У нашых вяскоўцаў на падворках утрымліваецца каля сотні кароў. У рэшце рэшт можна паспрабаваць адкрыць сваю справу.

***— А як вы ацэньваеце заканадаўства, што рэгулюе работу мясцовай улады? Можа тут патрэбныя змены ці ўдакладненні?***

— Я лічу, што нарматыўна-праўавыя акты ў нас распрацаваныя на добрым узроўні. Усё, што трэба для работы, ёсць. Вось, напрыклад, вядомы 100-ы Указ, які рэгулюе работу з нічыйнымі дамамі, альбо домаўладаннямі, якія засталіся без гаспадара, прапісвае ўвесь парадак дзеянняў мясцовага выканкама. Як правіла, не хапае толькі грошай, калі паўстае пытанне аб зносе нічыйнага альбо трухлявага дома. Апошнім часам мы ўзялі за правіла вельмі актыўна працаваць з нашчадкамі, сваякамі былых гаспадароў апусцелых пабудоў. Пры гэтым не чакаем адведзеных заканадаўствам паўгода. Адразу пачынаем перамовы са сваякамі, бо як паказвае практыка, потым можна і не знайсці іх каардынаты. І абсалютная большасць адгукаецца. Сваякі, нават калі яны і не прамыя нашчадкі, падтрымліваюць сядзібу ў парадку. Калі ж паўстае пытанне зносу дамоў, гэта таксама могуць зрабіць сваякі. За апошнія гады за кошт сельскага Савета ў нас было знесена 18 дамоў, за кошт родзічаў гаспадароў — 20.

***— Як вы сталі старшынёй сельскага Савета?***

— Нарадзіўся і вырас у тутэйшых мясцінах, скончыў Гарадзецкую школу. Пасля заканчэння ВНУ працаваў у мясцовым ляснасе. Двойчы мяне выбіралі дэпутатам сельскага Савета, а потым прапанавалі яго ўзначаліць. Я тут усіх ведаю, мяне ўсе ведаюць. За некалькі гадоў работы прыйшоў да высновы, што самае важнае для сельскага выканкама — гэта работа з насельніцтвам. Калі трэба сабраць грошы альбо правесці суботнік па добраўпарадкаванні могілак, важна пагаварыць з людзьмі, растлумачыць, пераканаць. Яшчэ трэба ўмець іх слухаць. Старэйшыя вяскоўцы часам падкажуць і параяць, калі самому бывае не проста знайсці правільнае рашэнне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Кобрынскі раён*

■

■ Май на ўвазе

# У МАРШРУТАЎ — НОВАЯ «ПРАПІСКА»

**З 1 чэрвеня са сталічнага аўтавакзала «Усходні» на вуліцы Ванеева перасталі хадзіць аўтобусы па прыгарадных, міжгародніх і міжнародных маршрутах.**

Пляцоўка там будзе выкарыстоўвацца для міжрэйсавага адстою. З гэтага дня ўсе міжгароднія і міжнародныя аўтобусы, якія дагэтуль выпраўляліся ў дарогу з «Усходняга», будуць адпраўляцца і прыбываць на аўтавакзал «Цэнтральны». Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», так зроблена для загрузкі апошняга. «Усходні» ж будзе выкарыстоўвацца для міжрэйсавага адстою аўтобусаў, таксама там будзе гасцініца. Нешматлікія прыгарадныя маршруты перанясуць з «Усходняга» на аўтастанцыі «Аўтазаводская» і «Паўднёва-Заходняя». У апошні час «Усходні» абслугоўваў магілёўскі, палескі і украінскі напрамкі.

**• Дарэчы**

З пачатку чэрвеня рэгулярныя рэйсы па ўнутрыабласных міжгародніх маршрутах адыходзяць ад аўтастанцыі «Аўтазаводскай», што побач са станцыяй метро «Магілёўская», і прыбываюць туды ж. Гаворка ідзе пра наступныя з іх: Мінск — Чэрвень, Мінск — Чэрвень — Градно, Мінск — Чэрвень — Дуброва, Мінск — Чэрвень — Красны Дар, Мінск — Чэрвень — Прыцерпа, Мінск — Чэрвень — Якшыцы, Мінск — Беразіно, Мінск — Беразіно — Белавічы, Мінск — Беразіно — Дулебы, Мінск — Беразіно — Стары Востраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# Пытанне — адказ

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у краіне ў суботу

Такі спосаб зносін уладаў і жыхароў дапамагае хутка, а галоўнае якасна, рэагаваць на праблемы. Колькасць зваротаў становіцца ўсё меншай, канстатуюць чыноўнікі, ды і праблемы грамадзян імкнуцца вырашаць, што называецца, па гарачых слядах.

**У гэтую суботу, 4 чэрвеня, з 9-ці раніцы да поўдня на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч — намеснік старшыні (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч — кіраўнік спраў (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч — намеснік старшыні (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
ЖУК Іван Алейзавіч — першы намеснік старшыні (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч — кіраўнік спраў (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
СІРЭНКА Віктар Іванавіч — намеснік старшыні (5004160);

**Мінскі гарвыканкам**
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч — намеснік старшыні (222 44 44).

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю вядомага беларускага вучонага і дзяржаўнага дзеяча ТУРА Андрэя Мікалаевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю загадчыка кафедры бізнес-адміністравання Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктара эканамічных навук, прафесара ТУРА Андрэя Мікалаевіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі са смерцю загадчыка кафедры бізнес-адміністравання Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктара эканамічных навук, прафесара ТУРА Андрэя Мікалаевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4 | |
| **Предмет аукциона** | | |
| **Наименование** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** |
| 947/1000 долей в праве собственности на **здание специализированное розничной торговли** | 344,1 кв.м | 130/С-3194 |
| **Адрес:** | Брестская обл., г. Пинск, ул. Ленина, д. 19 | |
| **Ограничения (обременения)** | Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник или по его поручению владелец обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство | |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания здания магазина предоставлен земельный участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0345 га. Ограничения (обременения) водоохранная зона реки Пина, площадь 0,0345 га, охранная зона канализационных коллекторов, площадь 0,0008 га | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 3 511 216 826 белорусских рублей. С учетом деноминации – 351 121 рубль 69 копеек** | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона (лота) в белорусских рублях перечисляется на расчетный счет 3012252296016 в ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк», код 739. Адрес банка: г. Минск, просп. Машерова, д. 29, УНП 191438026, получатель платежа – ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР» | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.07.2016** в 11ч. 00мин. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.07.2016** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Контактные телефоны** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. Email: auction@cpo.by** | |

**Публикация в газете «Звязда» от 02.06.2016 г.**

# НА АДЛЕГЛАСЦІ ВЫЦЯГНУТАЙ РУКІ



**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар.)**

Пры атрыманні наяўных грошай або правядзенні безнаяўнай аплаты асаблівую ўвагу трэба звяртаць на адпаведнасць названай вамі сумы і валюты аперацыі суме і валюце, якая змяшчаецца ў картчэку. Справа ў тым, што касір можа няправільна пачуць названую клієнтам лічбу або ненаўмысна памыліцца пры выдачы банкнот. Тут, як кажуць, можа спрацаваць чалавечы фактар. Таму пераправерыць атрыманую суму залішнім не будзе.

А яшчэ спецыялісты раяць падчас правядзення аперацый у пунктах выдачы наяўных грошай звяртаць асаблівую ўвагу на дзеянні работніка банка, калі апошні спрабуе правесці вашу картку праз тэрмінал прылады абсталявання больш як адзін раз. Гэта дазволіць прадухіліць правядзенне несанкцыянаваных вамі аперацый. Абавязкова пацікаўцеся прычынамі, па якой работніку неабходна паўторна правесці картку праз такую прыладу. Непасрэдна перад уводам пін-кода лепш яшчэ раз пераканацца, што сума і валюта будучай аперацыі супадаюць з вашым заказам.

## Ваш пін-код не для банкіра

Нават у аддзяленні банкаўскай установы эксперты рэкамендуюць пры ўводзе пін-кода прыкрываць клавіятуру далонню свабоднай рукі. І, галоўнае, ніколі і ні пры якіх абставінах нельга паведамляць пін-код работнікам банка. Гэтая парада найбольш актуальная для старых у невялікіх населеных пунктах, дзе знаёмая касірка лічыцца для іх амаль сяброўкай. Ніхто не збіраецца кідаць камяні ў бок такіх добрых адносін паміж людзьмі, але лішнюю асабістую інфармацыю нават сябры ведаць не павінны.

І апошняе. Перад тым, як падпісаць карт-чэк (у выпадку, калі гэта неабходна), трэба пераканацца, што сума, валюта аперацыі, дата аперацыі, тып аперацыі і іншыя звесткі, прапісаныя ў карт-чэку, правільныя.

Дарэчы, перад наведваннем банка не будзе лішнім узяць з сабою пашпарт, бо спецыяліст установы мае права запатрабаваць у кліента дакумент, які пацвярджае асобу для ідэнтыфікацыі трымальніка карткі і афармлення аперацыі. Аднак бываюць выпадкі, калі і наяўнасць пашпарта сітуацыю не ратуе. Напрыклад, летась мне неабходна было пакласці на картку жонкі грошы. А інфакіёскі ў той час наяўныя для папаўнення банкаўскага рахунку не прымалі. Тады паспрабавау я пакласці грошы на картку з дапамогай спецыяліста ў банкаўскім аддзяленні. Але мне адмовілі, нягледзячы на тое, што я тады прынёс ім адразу два пашпарты, свой і жонкі. І правільна зрабілі, бо існуюць дакладныя правілы, якія забараняюць перадаваць банкаўскія карткі трэцім асобам. А нашы фінансавыя адносіны ў сям'і банкаўскую структуру турбаваць не павінны.

## Каб не аплаціць пакупку двойчы

Шмат пытанняў у кліентаў узнікае ў сувязі з выкарыстаннем банкаўскай карткі ў арганізацыях гандлю. І на гэты конт у экспертаў Нацбанка падрыхтаваны спецыяльныя рэкамендацыі.

Так, пры правядзенні аперацый у рэстаранах, барах і крамах, аддаючы картку персаналу, які вас абслугоўвае, нельга выпускаць яе з поля зроку. Пры неабходнасці будзе нялішнім прайсці разам з работнікам арганізацыі гандлю да тэрмінала. Гэта дазволіць прадухіліць неправамернае капіраванне інфармацыі з карткі. А пры здзяйсненні аперацыі з выкарыстаннем плацежнага тэрмінала (POS-тэрмінала) касір можа запатрабаваць у кліента ўвесці пін-код або падпісаць карт-чэк у адпаведнасці з патрабаваннямі, вызначанымі правіламі плацежных сістэм, а таксама паказаць пашпарт у мэтах высвятлення асобы трымальніка карткі.

У крамах таксама трэба сачыць, каб касір не «гуляўся» вашай карткай і не праводзіў яе праз прыладу больш як адзін раз. Калі апошняе адбываецца, то трэба пацікавіцца прычынай. Калі пасля няўдалага правядзення аперацыі па картцы вы аплацілі куплю іншым спосабам (напрыклад, наяўнымі грашыма або іншай карткай), захавайце дакумент, які пацвярджае, што аплата не была спяхова праведзена, і праверце, ці не спісаліся з рахунку грашовыя сродкі па незавершанай аперацыі.

Пры ўвядзенні пін-кода ў грамадскім месцы трэба быць увогуле вельмі асцярожнымі. У гэтым выпадку звычка прыкрываць клавіятуру далонню свабоднай рукі павінна працаваць бездакорна. А яшчэ перад наборам пін-кода варта пераканацца ў тым, што людзі, якія знаходзяцца побач з вамі, не змогуць яго ўбачыць. Ніколі і ні пры якіх абставінах не паведамляйце пін-код работнікам арганізацый гандлю.

## Маленькая паперка таксама дакумент

Калі вы вырашылі адмовіцца ад куплі пасля паспяховага завяршэння аперацыі, то запатрабуйце адмяніць аперацыю. Абавязкова захоўвайце карт-чэк па аперацыі адмены да моманту зверкі выпіскі па рахунку, да якога выпушчана картка. У выпадку адмовы па якой-небудзь прычыне ад выкарыстання паслуг гасцініцы, пункта пракату і г. д. патрабуйце адмены блакіроўкі закладной сумы.

Калі бескантактныя аперацыі здзяйсняюцца ў рэжыме самаабслугоўвання, то трымальнікі «пластыку» не перадаюць картку ці іншы плацежны інструмент, які выкарыстоўваецца для аплаты (напрыклад, бранзалет, бірульку, мабільны тэлефон або іншую прыладу), касіру, а самастойна прыкладваюць картку да прылады тэрмінала для правядзення аперацыі.

Перад аплатай за тавары ці паслугі ў прыладах самаабслугоўвання арганізацый гандлю (сэрвісу) (напрыклад, на аўтазапраўачнай станцыі) неабходна вывучыць усю інфармацыю аб правілах здзяйснення плацяжоў, якая размешчана на экране прылады або побач з ёй, і выконваць інструкцыі гэтай сістэмы самаабслугоўвання.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*У наступным матэрыяле рубрыкі «Разумныя грошы» мы раскажам пра нюансы правядзення аперацый безнаяўнай аплаты з выкарыстаннем карткі ў інтэрнэце.*

■ Здаёмся!

# БЕЗ ТАЙНЫ ДЛЯ БАЦЬКОЎ

**«Да ўзяцця Рэйхстага заставаліся лічаныя дні, а на вуліцах горада ў асобных яго кварталах яшчэ ішла перастрэлка, завязваліся зацятыя баі. Ашалелыя ў сваёй нянавісці, на апошняй мяжы адчаю, гітлераўцы хапаліся за кожную сцяну і камень, толькі б знішчаць, знішчаць...» — гэта ўрывак з тэксту «Просты рабочы чалавек», які прапанавалі адзінаццацікласнікам на выпускным экзамене па беларускай мове.**

Учора ў краіне распачаліся экзамены за курс сярэдняй школы. І ўпершыню ў бацькоў, якія хваляваліся за сваіх дзяцей, была магчымасць яшчэ падчас экзамену асабіста пазнаёміцца са зместам заданняў. Міністэрства адукацыі (у тэставым рэжыме) размясціла на сваім сайце заданні па беларускай, рускай мове і матэматыцы для вучняў 11-х класаў, якія вывучалі гэтыя дысцыпліны на базавым і павышаным узроўні. Можна, вядома, задацца пытаннем, наколькі цікава 17-гадовым падлеткам пісаць пераказ пра бабрыху Клару, мядзведзіцу, у якой людзі забралі медзведзянят, ці «сямейную пару» ласёў (экзаменацыйныя камісіі маглі выбіраць з двух прапанаваных тэкстаў адзін). Адно можна сказаць дакладна: бацькам было цікава даведацца, што ж сабой уяўляе выпускны экзамен, у тым ліку і па матэматыцы. І чым адрозніваюцца заданні па матэматыцы для базавага і павышанага ўзроўню вывучэння прадметаў...

Па шматгадовай традыцыі тэксты і заданні для экзаменаў у пісьмовай форме абвяшчаюцца ў нашай краіне па тэлебачанні і радыё. Але ў Міністэрстве адукацыі не выключаюць, што ў перспектыве можа застацца толькі адзін канал інфармавання — міністэрскі сайт.

У бягучым годзе сярэднюю школу ў Беларусі заканчваюць 57,4 тысячы выпускнікоў 11-х класаў. Яны здаюць чатыры экзамены: пісьмовыя — па матэматыцы і пішуць пераказ па беларускай ці рускай мове на выбар; вусныя — па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

2 чэрвеня распачнуцца экзамены і для выпускнікоў базавай школы. Іх змест таксама можна будзе знайсці на сайце Міністэрства адукацыі www.edu.gov.by. Дзевяцікласнікаў чакаюць дыктоўка па беларускай і рускай мовах і пісьмовы экзамен па матэматыцы.

# Хімія і біялогія «руляць»

**У Ліцэі БДУ падвялі вынікі ўступнай кампаніі. Усяго сёлета сюды было пададзена 1667 заяў, у тым ліку 32 — ад пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд. Агульны конкурс склаў 7 чалавек на месца.**

Самы высокі конкурс (11,8 чалавека на месца) утварыўся на рускім філалагічным кірунку. А найбольшая колькасць заяў ад абітурыентаў паступіла на хіміка-біялагічны профіль — 363. На адно месца тут было зарэгістравана 9,4 прэтэндэнта.

Прахадны бал на філалагічны кірунак (руская—англійская мова) склаў 123, на хіміка-матэматычны і фізічны — 132, хіміка-біялагічны — 131, філалагічны (беларуская мова) — 125, прыкладная інфарматыка — 130, матэматычны — 119, гісторыка-грамадазнаўчы — 114. Прахадныя балы выраслі па ўсіх профілях.

Жыхароў сталіцы сярод будучых ліцэістаў 76%, астатнія 24% — прадстаўнікі з усіх абласцей Беларусі.

Усяго ў гэтым годзе ў Ліцэй БДУ ў 10-ы клас будзе прынята 264 навучэнцы, з якіх будуць сфарміраваны 12 класаў па 22 чалавекі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## СМЯРОТНАЯ ВАКЦЫНА

**У Гродне шасцігадовая дзяўчынка, якая пражывала ў абласным цэнтры, памерла пасля ўвядзення камбінаванай вакцыны. Адбылося гэта на вачах у маці...**

Па словах афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці Сяргея Шаршаневіча, вакцына супраць адру, паратыту і краснухі была ўведзена дзіцяці ў дзіцячай паліклініцы №1 абласнога цэнтра. Пасля гэтага стан здароўя дзяўчынкі рэзка пагоршыўся і, нягледзячы на аказаную медыцынскую дапамогу, яна скanaла ў прысутнасці сваёй маці. Заведзена крымінальная справа па факце ненадлежнага выканання прафесійных абавязкаў медыцынскімі работнікамі, следчыя правялі агляд месца здарэння. Падчас апошняга канфіскаваны ампулы з вакцынай, выкарыстаныя ампулы і шпрыцы, а таксама медыцынскія прэпараты з прышчэпкавага кабінета. Да матэрыялаў справы далучана для вывучэння ўся медыцынская дакументацыя, фінансава-бухгалтарскія дакументы па атрыманне вакцын. На пытанне: «Чыёй вытворчасці вакцына і як доўга выкарыстоўваецца?» Сяргей Шаршаневіч лаканічна адказаў, што і гэта трэба будзе высветліць следству. Прызначаны судова-медыцынская і шэраг іншых экспертыз. Следчыя працуюць з медыцынскімі работнікамі паліклінікі, пацыентамі.

Правільнасць дзеянняў персаналу пры трагедыі ў паліклініцы ў Гродне правярае і камісія Міністэрства аховы здароўя. Туды выехалі спецыялісты на чале з дырэктарам РНПЦ «Маці і дзіця».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ НА СВЯТА КУПАЛЛЯ

**Беларуская чыгунка прызначае на 9-10 ліпеня дадатковыя цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа для перавозкі ўдзельнікаў і гасцей свята Купалле («Александрыя збірае сяброў») у Шклоўскім раёне.**

Дадатковыя саставы будуць курсіраваць па маршруце Магілёў — Шклоў — Копысь (вёска Александрыя) — Шклоў — Магілёў і Орша — Копысь — Орша. Кошт праезду складзе: у зносінах Магілёў — Александрыя (станцыя Копысь) — 8,2 тысячы рублёў, у зносінах Орша — Александрыя (станцыя Копысь) — 5,3 тысячы рублёў.

Таксама, як паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, 9 ліпеня прадугледжана дадатковае спыненне цягніка рэгіянальных ліній бізнес-класа №784 Магілёў — Орша на станцыі Копысь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## «ШУМАХЕР» НА ДАРОЗЕ

**Кіроўца імчаў па трасе на хуткасці амаль 300 кіламетраў у гадзіну.**



Гэты выпадак быў зафіксаваны ў Шчучынскім раёне на трасе М6 Мінск — Гродна, дзе і затрымалі лихача. У поле зроку інспектараў ДАІ трапіў пазадарожнік «Мерседэс», кіроўца якога «выціскаў» з аўтамабіля 299 кіламетраў у гадзіну. Ім быў 23-гадовы жыхар Мінска, машына зарэгістравана на яго маці. Паводле інфармацыі ДАІ, малады чалавек дагэтуль 27 разоў прыцягваўся да адказнасці за розныя парушэнні правілаў дарожнага руху, у тым ліку 14 разоў — за перавышэнне хуткасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## БІЗНЕСМЕН ВЫПАЎ З АКНА

**Ранкам у сталіцы было знойдзена цела загінулага прадпрымальніка.**

Мёртвага мужчыну пад вокнамі аднаго са шматпавярховых дамоў у Савецкім раёне знайшлі суседзі. Адбылося гэта прыкладна ў чатыры гадзіны раніцы. Устаноўлена, што 48-гадовы прадпрымальнік выпаў з дзясятага паверха. Бізнесмен жыў у гэтым самым доме. Як паведамляе прэс-служба Следчага камітэта, адной з версій здарэння з'яўляецца самагубства, аднак разглядаюцца і іншыя. Зараз высвятляюцца дакладны час і абставіны смерці мужчыны. Следчыя працуюць з роднымі і суседзямі нябожчыка, шукаюць магчымых сведак. Чакаюцца вынікі судова-медыцынскай экспертызы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


УНП 101015738

**РУП «БЕЛПОЧТА»**

**повторно** объявляет о проведении переговоров по выбору подрядной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт спортивных площадок на территории базы отдыха «Дружба».

**Процедура переговоров состоится «03» июня 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

**Контакты для получения дополнительной информации:** отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29, 222-62-88.



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ**
**17 июня 2016 года повторных торгов**
**по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Квартира №28, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, общей площадью 106,9 м², жилой площадью 67,6 м² (трехкомнатная квартира на 6-м этаже 16-этажного дома 2006 года постройки, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-718822) |
| **Начальная цена (начальная цена с учетом деноминации) в белорусских рублях** | 2 164 677 200 (216 467,72) |
| **Сумма задатка в белорусских рублях** | 216 000 000 |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:** заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель — коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 17 июня 2016 г. в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 02.06.2016 по 13.06.2016** включительно в рабочие дни **с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** (по пятницам – до 16.45) **по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36.**

# Мяшаць бетон — не дамская справа



Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Для наймальнікаў, мяркуючы па ўсім, гэты факт мае значэнне. Прыкладна палова працадаўцаў пры падборы персаналу падкрэслівае, што хацелі б бачыць мужчын. Такая тэндэнцыя назіраецца і ў прыватных, і ў дзяржаўных кампаніях.

**Працаваць у сферу адукацыі жанчыны часам ідуць, каб быць побач са сваімі дзецьмі і ўнукамі. Тут у іх ёсць магчымасць адначасова клапаціцца пра малых і рэалізоўваць сябе ў прафесіі.**

— Часам гэтае пажаданне выказваюць вельмі рэзка, — заўважае Святлана Карасцялёва. — У любым выпадку кожны раз нам даводзіцца даказваць, што на канкрэтнай пасадзе жанчына справіцца не горш за мужчыну. І, трэба адзначыць, апошнім часам усё часцей удаецца пераконваць працадаўцаў, што дамы ў нас сёння адукаваныя і вопытныя. Адваротны ж варыянт, калі шукаюць на нейкае месца менавіта жанчыну, вельмі рэдкі.

А вось брунетка саіскальніца ці бландзінка, наймальніку ўсё роўна. У кансалтынгавым агенцтве запэўніваюць, што ніхто па знешнасці не выбірае. Так, фотаздымак у рэзюме патрэбен. Але ён прыкладаецца для таго, каб кандыдата запомнілі, а не ацанілі яго выгляд.

## Чаканні грамадства

Умоўны падзел прафесій на мужчынскія і жаночыя дагэтуль захоўваецца. Прадстаўнікі моцнага полу пераважаюць у такіх галінах, як будаўніцтва, прамысловасць. У той жа час большасць работнікаў сферы гандлю, фінансаў, гасцінічнага бізнесу складаюць дамы. У медыцыне і адукацыі доля жанчын — да 80 працэнтаў. **Дацэнт факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Алена ЯКІМОВІЧ** адзначае, што гэта тэндэнцыя гендарнага падзелу рынку закладаецца яшчэ на этапе вышэйшай адукацыі:

— У вядучых ВНУ на гуманітарных спецыяльнасцях, такіх, як педагогіка, дызайн, мытная справа, большасць студэнтаў — гэта дзяўчаты. Тую ж сітуацыю назіраем, напрыклад, на юрыдычным факультэце, факультэце міжнародных адносін. Адпаведна гэта тэндэнцыя адбіваецца і на працоўных сферах.

Што перашкаджае дзяўчатам засвойваць тэхнічныя профілі? Алена Якімовіч мяркуе, што справа ў стэрэатыпах.

— Стэрэатыпы ў грамадстве ўплываюць на моладзь вельмі моцна. Школа часткова таксама выхоўвае ў дзецях розныя якасці. Хлопцаў заклікаюць добра разбірацца ў тэхніцы і лічбах, а дзяўчатам паўтараюць, што яны павінны шыць і рабіць прыгожыя рэчы.

Выкладчыца ўніверсітэта дадае, што, магчыма, жанчыны больш арыентуюцца на «чыстую» працу. Мяшаць бетон і будаваць дарогі беларускі ў большасці сваёй не гатовы.

Чаму жанчыны згаджаюцца на менш аплатныя вакансіі? Святлана Карасцялёва лічыць, што яны проста могуць сабе гэта дазволіць. Грамадства не патрабуе ад дам атрымліваць шмат грошай, таму, верагодна, прадстаўніцы прыгожага полу часцей выбіраюць працу па душы ці тую, дзе ім будзе лягчэй. Мужчыну ж традыцыйна прыпісваюць ролю карміцеля. Калі ён не зможа прыстойна зарабляць і забяспечваць сям'ю, будзе лічыць сябе непаўвартасным. Таму мужчыны больш арыентаваны на прыбытак.

Працаваць у сферу адукацыі жанчыны часам ідуць, каб быць побач са сваімі дзецьмі і ўнукамі. Тут у іх ёсць магчымасць адначасова клапаціцца пра малых і рэалізоўваць сябе ў прафесіі. А ў сітуацыі з сацыяльнымі работнікамі дам сярод спецыялістаў хочуць бачыць самі кліенты. Паколькі большасць падапечных сацслужбаў — пенсіянеркі, ім камфортней, калі прыбірацца і весці задушэўныя размовы прыходзяць жанчыны.

## Хто найлепшы кіраўнік?

У навучанні дзяўчаты больш паспяховыя за хлопцаў. Доля жанчын сярод выпускнікоў універсітэтаў — 61 працэнт. У працоўнай сферы тэндэнцыя ж іншая. Нягледзячы на большую адукаванасць, дамы радзей выбіваюцца на важныя пасады. У шэрагах высокапастаўленых чыноўнікаў, менеджараў і заканадаўцаў жанчын быццам бы і нямала — да 48 працэнтаў. Але калі казаць пра кіраўнікоў першага звяна, там доля прадстаўніц прыгожага полу значна меншая.

— Можа, і самі жанчыны не ідуць вышэй, можа, ім цяжка, — спрабуе знайсці тлумачэнне такой сітуацыі Алена Якімовіч.

На думку Святланы Карасцялёвай, беларускі хочуць рабіць кар'еру не менш за мужчын. Але разумеюць, што, пакуль не вырашацца пытанні, звязаныя з дзецьмі, гэта будзе не вельмі зручна. Прасоўванне па службовай лесвіцы ва ўмовах, калі паралельна трэба знаходзіць час і на сям'ю, патрабуе ад жанчыны нашмат больш высілкаў, чым ад мужчыны. Зноў жа згадаем даследаванне Белстата. Згодна з ім, дамы штодзень трацяць на вядзенне хатняй гаспадаркі і догляд за дзецьмі амаль на дзве з паловай гадзіны больш, чым іх суайчыннікі.

Ды і сам дэкрэтны ў нейкім сэнсе выбівае жанчыну з працоўнай каляіны. Ідучы на тры гады ў водпуск, яна адстае ў кваліфікацыі і вопыце. Мужчына ж за гэты час засвойвае прафесію глыбей. Адпаведна, і заробак, і пасада, на якія ён зможа прэтэндаваць, будуць вышэйшымі.

У народзе прынята лічыць, што найлепшыя кіраўнікі — мужчыны. Практыка ж паказвае, што на топавых пасадах, такіх як генеральны, камерцыйны дырэктар, дырэктар па персанале ці вытворчасці, аднолькава добра працуюць прадстаўнікі абодвух палоў.

— Я нават сказала б, што жанчыны спраўляюцца лепей, — дзеліцца назіраннямі кіраўнік кансалтынгавай кампаніі. — Ім складаней трапіць на гэтыя пасады праз стэрэатыпнае мысленне працадаўцаў, таму даводзіцца прыкладаць больш высілкаў, каб утрымацца на высокіх месцах. А мужчына, мне здаецца, ведае, што, паколькі ён мужчына, то пры іншых роўных умовах яго выберуць з большай верагоднасцю, і не так напружваецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «НАМ З ВАМІ ПА ДАРОЗЕ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Нам з вамі па дарозе» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 7 чэрвеня па 30 верасня 2016 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Палатка Atemi 185 (2-месная) | 7 | 663 400 | 4 643 800 |
| 2. | Веласіпед Stels Navigator 700 V 2016 (19, сіні металік/чорны) | 1 | 5 844 400 | 5 844 400 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» складае 10 488 200 (Дзесяць мільёнаў чатырыста восемдзесят восем тысяч дзвесце) беларускіх рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Нам з вамі па дарозе» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 7 чэрвеня па 13 ліпеня 2016 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 па 30 чэрвеня 2016 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 13 ліпеня 2016 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 14 ліпеня 2016 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 турыстычных палатак (па адной для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — веласіпед.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 ліпеня 2016 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 ліпеня 2016 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2016 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2016 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2016 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 верасня 2016 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў дзеля атрымання прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 верасня 2016 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2768 ад 26.05.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

# ЧЫРВОНКА
## Чырвоная змена

2 ЧЭРВЕНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 10 (15794)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

## Ян ЯРАШ:
# «Музыка — на першым месцы»

**Наш чарговы герой — прадстаўнік маладой хвалі артыстаў, якія сёння пракладаюць свой маршрут на вялікую сцэну. Яшчэ школьнікам хлопец змог прабіцца ў гурт «Без білета» і пэўны час быў там клавішнікам, потым іграў у шэрагу іншых груп. А год назад з'явіўся перад публікай ужо ў новай ролі — вакаліста ў тэлепраекце «Акадэмія талентаў», дзе дайшоў да фіналу. Зусім нядаўна мы маглі назіраць за яго ўзлётам на ўкраінскім «Голасе краіны». У свет выйшлі ўжо тры сольныя кампазіцыі, ён супрацоўнічае з гуказапісвальнай кампаніяй Warner Music Russia.**

— У маёй сям'і па мацярынскай лініі заведзена традыцыя: усім дзецям даваць музычную адукацыю. Два мае старэйшыя браты таксама вучыліся ў музычнай школе, аднак выбралі прафесіі праграміста і хірурга, — расказвае Ян пра сваё знаёмства са светам музыкі. — Падчас вучобы мне ўсё вельмі лёгка давалася і, скажу шчыра, я не задумваўся, ці варта мне звязваць жыццё са сцэнай. Разам з тым бачыў прыклад старэйшых братоў, якія вучыліся ў музычнай школе на «выдатна», і гэта прывяло да думкі, што і я павінен быць не горшым. У выніку настолькі захапіўся вакалам і ігрой на інструменце, што зразумеў — акрамя музыкі, мяне больш нішто не цікавіць.

Ёсць меркаванне, што творчымі прафесіямі не заробіш сабе на хлеб. Таму я ў 15 гадоў пайшоў працаваць у краму, каб праверыць, ці па душы мне і па сілах здабываць грошы на жыццё іншым спосабам, калі з музыкай нічога не атрымаецца. Паралельна пачаў іграць з адным кавер-бэндам. Потым прадаваў «клавішы» і якраз тады на сайце крамы сярод аб'яў аб куплі і продажу знайшоў інфармацыю, што гурт «Без білета» шукае клавішніка. Са страхам, але я ўсё ж такі адважыўся пайсці на праслухоўванне, і мяне ўзялі на выпрабавальны тэрмін.

***— Потым была праца і ў шэрагу іншых праектаў...***

— Я з ліку тых людзей, якія любяць быць занятымі справай. Быў час, калі паралельна супрацоўнічаў з пяццю калектывамі. Мой графік, які складаўся з рэпетыцый і канцэртаў, быў распісаны па гадзінах на тыдні наперад, а адчуваў я сябе пры гэтым выдатна. І, думаю, жаданне быць загружаным па максімуме ў мяне засталося.

***— А распачаць сольную кар'еру артыста пасля чаго адважыліся?***

— Калі 17-гадовым юнаком я пачынаў працаваць у гуртах, то разумеў, што не гатовы яшчэ рабіць нешта на якасным узроўні ў музыцы. Для гэтага патрэбна было папрацаваць з рознымі камандамі, разабрацца, што і да чаго ў музычным асяродку.



Мне пашчасціла трапіць у гурт «Без білета». Гэта дало магчымасць усвядоміць, што прыспеў час падзяліцца з публікай сваімі ўласнымі думкамі...

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Гісторыя і сучаснасць*

# ЭХ, МАЛАДАЯ!..

### На гэтай думцы сышліся ўдзельнікі «круглага стала», прысвечанага нядаўняму 95-годдзю «Чырвонай змены» — газеты, з якой пачалася ўся маладзёжная прэса на савецкай прасторы

**За доўгія гады чаго толькі не было: змены назвы, мовы, колеру... Месцы ветэранаў займалі прадстаўнікі наступнага пакалення... Учарашнія пачаткоўцы, атрымаўшы дзякуючы газеце пуцёўку ў жыццё, станавіліся масцітымі аўтарамі... Чытачы, якія на пачатку існавання «Чырвонай змены» вучыліся чытаць па яе артыкулах, рабіліся сябрамі-аднадумцамі... Мянялася сама некалі вялікая дзяржава, і гэтыя змены — і трагічныя, і радасныя — знаходзілі адлюстраванне на старонках выдання... Мяняліся нават не часы — эпохі. Нязменным на працягу ўсяго гэтага часу было толькі адно: маладзёжны задор газеты! І, як сышліся на думцы ўдзельнікі «круглага стала», цяперашняя «Чырвонка. Чырвоная змена» як мае быць працягвае тую слаўную традыцыю. Дэвіз дадатку: маладыя пішуць для маладых і пра маладых!**

**Пра гісторыю, повязь часоў і пакаленняў, ролю газеты ў выхаванні маладога пакалення і яе нішу ў віртуальнай прасторы, «партрэт» маладога сучасніка гаварылі ветэраны выдання, прадстаўнікі ўлады, шэрагу міністэрстваў, БРСМ, а таксама тыя, хто напаўняе матэрыяламі старонкі сённяшняй «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*Свой стыль*

# ІЛЬНЯНАЯ РАПСОДЫЯ

### МАДЭЛЬЕР-ПАЧАТКОВЕЦ — ПРА АСАБЛІВАСЦІ ПРАФЕСІІ

**Вось каму лёгка ўвесь час быць у трэндзе! Не паспее капрызная мода прыдумаць нешта новае, як мадэльер гэтую думку ўжо ўвасобіў у жыццё. І — крочыць сабе «паперадзе планеты ўсёй». Сёння, напрыклад, модна насіць падоўжаныя камізэлькі з палітовай тканіны або паліто без рукавоў. Каця НОВІКАВА ўжо даўно сабе такія ўборы пашыла. Яшчэ і іншых абноўкамі парадавала. Пасля ўдзелу ў конкурсе маладых дызайнераў Беларускага тыдня моды яна стала ў родных Горках дастаткова вядомым майстрам.**

Тым, кім яна з'яўляецца, Кацярына абавязана свайму захапленню маляваць. Любіла займацца гэтай справай з дзяцінства, таму і прафесію выбірала з такім ухілам. Цяпер яна — студэнтка Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта, дзе вучыцца на інжынера-канструктара. Хацела паступіць сюды адразу ж пасля школы, але пабаялася, што для спецыяльнасці «Дызайнер інтэр'ера», аб якой марыла на той час, не хопіць балаў. Пайшла вучыцца ў каледж на мадэльера.



У такой сукенцы — хоць на баль.

— Гэта быў той выпадак, калі прафесія выбрала мяне сама, — усміхаецца дзяўчына. — На швейную машынку ў мяне была «алергія». Маці шыла ўсё жыццё і я, наглядзеўшыся на яе, спадзявалася, што ніколі гэтага рабіць не буду. Але вось паступіла і пасля першай практыкі ўжо іншымі вачыма глядзела на прафесію. Спачатку шмат чаго не атрымлівалася, былі сапраўдныя істэрыкі. Потым уцягнулася і... спадабалася.

Для мадэльера мець сваю калекцыю прэстыжна, але заўсёды рызыкоўна. Калі цябе не заўважылі эксперты, сродкі патрачаны дарэмна. Таму калі падчас вучобы выпадае шанц паўдзельнічаць у конкурсе, лічы, пашчасціла, бо ўсе выдаткі нясе адукацыйная ўстанова. Курсавая праца Кацярыны была ацэнена вельмі высока, заставалася ўвасобіць у жыццё тое, што існавала на паперы. Прычым за абмежаваны час. А гэта было не так проста. Дзесяці нават сяброўкі па каледжы дапамагалі. Але цяжка апісаць тую гаму пачуццяў, якія дзяўчына перажыла, калі эскізы атрымалі натуральныя формы: ура, я змагла! Праўда, калекцыю прыйшлося пакінуць у альма-матар.

Як нараджаліся ідэі? Кацярына сціпла пацiскае плячыма: гэта ж творчасць — усё адбываецца непрадказальна. Смяецца, што яе льняная калекцыя была «навеяна» хаджэннем па віцебскіх крамах. «Убачыла тканіну — і вобразы пачалі ўзнікаць у галаве, — успамінае яна. — Спачатку адну мадэль уявіла, потым другую. Калі тканіна прыгожая, ідэі прыходзяць самі па сабе».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
02 06 2016 г.




Працоўны семестр

# АД КРАСНАДАРА — ДА ХАНТЫ-МАНСІЙСКА

## Геаграфія студатрадаўскага руху пашыраецца

**Не менш як 70 тысяч маладых людзей і падлеткаў плануе сёлета працаўладкаваць Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў. Акцыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Выбіраем студатрад!» стартавала ў краіне 1 красавіка, але самыя матанакіраваныя студэнты пачалі прыносіць заяўкі ў штабы працоўных спраў яшчэ зімой... І гэта не дзіўна, бо ў многія студатрады сур'ёзны конкурс. Хто ж адмовіцца адначасова і адпачыць, і падзарабіць, і паглядзець суседнюю краіну?**

### Выхаваўчы складнік

— За межы Беларусі плануецца адправіць сёлета звыш 600 чалавек, — расказала **камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў ЦК БРСМ Надзея ШАХОЎСКАЯ**. — У Архангельскую вобласць ужо выехаў сэрвісны атрад. За ім услед адпраўляецца педагагічны атрад для працы ў дзіцячым аздараўленчым летніку «Зорачка». Традыцыйна маладыя людзі будуць працаваць у Краснадарскім краі ў складзе педагагічных і сэрвісных атрадаў. Сельскагаспадарчы атрад адправіцца ў Падмаскоўе, сэрвісны і будаўнічы атрады — у Санкт-Пецярбург, яшчэ адзін будаўнічы атрад паедзе ў Ханты-Мансійскую аўтаномную акругу. Сёлета, на жаль, нашы студэнты не будуць працаваць праваднікамі на расійскай чыгунцы, але ў наступным, спадзяёмся, мы адновім гэтую практыку.

Як адзначае **начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ**, пачынаючы з 2011 года ў краіне пастаянна расце колькасць удзельнікаў студатрадаўскага руху: з 27 тысяч да 70 тысяч...

— Вельмі важна ўтрымаць гэту планку. Але сёння галоўную ўвагу і акцэнт хацелі б перанесці на змястоўнасць працы, так бы мовіць, на фарміраванне ідэалогіі студатрадаўскага руху, паколькі студатрад — гэта не толькі месца для зараблівання грошай і магчымасць заняць сябе ў вольны ад вучобы час, але і магутнае выхаваўчае асяроддзе, якое фарміруе ў тым ліку і будучых лідараў, — падкрэсліла Наталля Пшанічная.

**Упершыню гэтым летам Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў фарміруе археалагічны студэнцкі атрад. Ён будзе працаваць у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці.**

Паводле яе слоў, профільнае ведамства зацікаўлена ў прыцягненні ў склад студатрадаў большай колькасці непаўналетніх, у тым ліку падлеткаў, якія патрабуюць да сябе больш павышанай педагагічнай увагі, стаяць на ўліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх. У такіх атрадах цяжкія падлеткі заняты карысная дзейнасцю, маюць магчымасць раўняцца на старэйшых. У 2014 годзе ў Беларусі, напрыклад, было задзейнічана ў студатрадах 28 тысяч непаўналетніх, а ў 2015-м — ужо больш за 34 тысячы... У студэнцкія атрады могуць уключацца маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года.

### Даведка ЧЗ

**З 1 студзеня па 1 мая 2016 года рознымі формамі другаснай занятасці былі ахоплены 13 335 маладых людзей. З іх 272 чалавекі працавалі ў 26 будаўнічых атрадах, 48 чалавек — у двух сельскагаспадарчых атрадах, 1245 — у 52 экалагічных атрадах, 402 — у 25 сэрвісных атрадах і 703 чалавекі — у 43 медыцынскіх атрадах. Усяго ў студатрадах працавалі 2660 чалавек, з іх 590 — непаўналетнія.**

**У добраахвотніцкіх атрадах працавалі 11 378 чалавек, з іх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў — 7809 чалавек. Усяго рознымі формамі другаснай занятасці былі ахоплены 505 падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх.**

### Падатковыя льготы

У красавіку ў Мінску прайшло пасяджэнне Савета па справах моладзі СНД, на якім актыўна абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва і фарміравання сумесных атрадаў. Беларускім досведам арганізацыі студатрадаўскага руху зацікавіліся Казахстан і Азербайджан. У нашу краіну працаваць у складзе студатрадаў прыедуць гэтым летам студэнты з Расіі, Украіны і Казахстана (казахі, якія навучаюцца ў Томскім дзяржаўным універсітэце).

18 атрадаў, у тым ліку інтэрнацыянальных, будуць задзейнічаны на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы (усяго каля 400 чалавек). Для таго, каб трапіць сюды, трэба мець добрае здароўе, бо давядзецца працаваць на вышыні, і не менш як 3-ці разрад па любой будаўнічай спецыяльнасці. Гэтым летам на ўзвядзенні Беларускай АЭС запатрабаваны зваршчыкі, стропальшчыкі, бетоншчыкі, маляры, інжынеры... Дарэчы, самы высокі заробак падчас трэцяга працоўнага семестра быў летась менавіта ў Астраўцы — ён даходзіў да 11,8 мільёна рублёў.

Вось ужо другі год запар інтэрнацыянальны беларуска-расійска-ўкраінскі атрад будзе працаваць і на рэканструкцыі стадыёна «Дынама» ў Мінску — гэты аб'ект быў аб'яўлены Мінгарвыканкамам гарадской маладзёжнай будоўляй. У яго склад увойдуць 30 студэнтаў, якія будуць шчыраваць на знакавым аб'екце каля 1,5 месяца і выконваць шырокі спектр будаўнічых работ: земляныя і бетонныя работы, вязку арматуры, дэмантаж і іншыя. А ў вольны ад працы час маладых людзей чакаюць




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

міжнародны турнір па міні-футболу, экскурсіі па сталіцы, наведванне музея Вялікай Айчыннай вайны, мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, канцэртных пляцовак і іншыя мерапрыемствы.

Наталля Пшанічная нагадала, што дзейнасць студатрадаў у Беларусі рэгламентуе Указ кіраўніка дзяржавы «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў», які значна спрасціў іх фарміраванне і ўзгадненне пераліку аб'ектаў, дзе студэнты могуць і працаваць, і зарабіць, і дзе ёсць работа для студэнцкіх рук. Штогод гэты дакумент карэктуецца з улікам рэалій і пажаданняў моладзі. «Так, напрыклад, практыка паказала, што таго пераліку студэнцкіх атрадаў, які ёсць ва ўказе, сёння ўжо недастаткова. Моладзь праяўляе цікавасць да працы ў медыцынскіх атрадах, на вытворчасці. І гэты пералік быў пашыраны. Магчыма, калі-небудзь гэты пералік стане адкрытым, — адзначыла начальнік упраўлення. — Напрыклад, перспектыўным кірункам з'яўляюцца IT-атрады, якія ўжо працуюць у БДУІР і тэхнічных універсітэтах».

Упершыню гэтым летам Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў фарміруе археалагічны студэнцкі атрад. Ён будзе працаваць у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці. Усяго плануецца набраць 30-40 чалавек. Узначаліць археалагічную экспедыцыю прафесар Сяргей Расадзін. Конкурс сярод ахвотных плануецца аб'явіць у ліпені, а працаваць атрад пачне з 1 жніўня.

Добрай навіной для студэнтаў стала дапаўненне, унесенае ў Падатковы кодэкс. Згодна з ім, ад падаходнага падатку цяпер будуць вызваляцца даходы, атрыманыя за працу ў складзе студэнцкіх атрадаў не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц СНД.

— Нашы студэнты, якія ў складзе студатрадаў працуюць у Расіі, заплацяць там падатак у 13%, як і расійскія студатрадаўцы. А па вяртанні дамоў ім цяпер ужо не трэба будзе падаваць дэкларацыю і другі раз плаціць падатак, — патлумачыла Наталля Пшанічная.

### Першы працоўны капітал

Тры гады таму ў нашай краіне — амаль пасля 20-гадовага забыцця — пачалі адраджаць дзейнасць летніх лагераў працы і адпачынку. І гэты від арганізацыі баўлення часу працягвае набіраць абароты.

Пералік аб'ектаў, дзе будуць працаваць падлеткі, фарміруецца на рэгіянальным узроўні, а патрэбы пралічваюцца, зыходзячы са спецыфікі рэгіёна: калі рэгіён сельскагаспадарчы, то асноўнымі аб'ектамі стануць аграпрамысловыя арганізацыі, а калі рэгіён прамысловы, то, безумоўна, для старшых школьнікаў знойдзецца некваліфікаваная праца на прамысловых прадпрыемствах ці ў гандлёвых аб'ектах. У бягучым годзе праз працоўныя летнікі пройдуць 14,2 тысячы чалавек, але толькі 2,2 тысячы падлеткаў будуць працаваць і адпачываць у лагерах з кругласутачным знаходжаннем.

— У сталіцы ў працоўных лагерах з дзённым знаходжаннем пажадалі працаваць гэтым летам 1150 дзяцей, — расказала **начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ**. — Свае працоўныя лагеры ствараюць Мінскі палац дзяцей і моладзі і іншыя ўстановы дадатковай адукацыі. Да таго ж

**Ад падаходнага падатку цяпер будуць вызваляцца даходы, атрыманыя за працу ў складзе студэнцкіх атрадаў не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц СНД.**

працоўныя змены будуць арганізаваны і на базе 10 стацыянарных загарадных летнікаў. Яны карыстаюцца вялікім попытам: найлепшай рэкламай для такіх змен становіцца «сарафаннае» радыё...

У 2014 годзе пералік работ, да якіх могуць прыцягвацца падлеткі, быў пашыраны, і сёння ў яго ўваходзяць **праполка саджанцаў і сеянцаў, рыхленне глебы, збор каласкоў, сушка збожжа на таку, добраўпарадкаванне мемарыялаў, воінскіх пахаванняў і абеліскаў, рамонт школьных памяшканняў і мэблі, збор ягад у сельскагаспадарчых прадпрыемствах, работы па добраўпарадкаванні малочнатаварных ферм, пашыў спецадзення, бялізны, падушак і коўдраў з сінтэпону. Падлеткі афармляюць вітрыны, займаюцца выкладкай тавару, дастаўляюць пошту, робяць сувеніры, разносяць амбулаторныя карткі ў паліклініках.**

Натуральна, у многіх узнікае пытанне, а колькі падлетак можа зарабіць? Усё залежыць ад віду работ, прадукцыйнасці працы і працягласці змены. У лагерах, дзе падлеткі працавалі 18 дзён, летась заробак даходзіў да 2 мільёнаў. Не варта забываць, што працуюць падлеткі ўсяго 4 гадзіны...

У 2016 годзе памер фінансавых сродкаў на забеспячэнне часовай занятасці моладзі, закладзеных у Дзяржаўную праграму садзейнічання занятасці, павялічыўся ў 1,5 раза: на гэтыя мэты плануецца накіраваць 45,5 млрд рублёў. Праз службы занятасці працаўладкоўваюцца штогод каля 30 тысяч навучэнцаў (85 працэнтаў з іх — гэта школьнікі).

Існуе некалькі спосабаў паспрабаваць знайсці для сябе на лета падпрацоўку. Па-першае, школьнікам можна звярнуцца да намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце і агучыць сваё жаданне. Яму павінны падказаць, у якой установе адукацыі будзе дзейнічаць лагер працы і адпачынку. Другі спосаб — звярнуцца ў службу занятасці па месцы жыхарства. Трэці — пацікавіцца магчымасцю працаўладкавацца ў студатрад у Штабе працоўных спраў ВНУ, у раённым ці абласным штабе працоўных спраў БРСМ. Пры наяўнасці вакантных месцаў школьнікам там не павінны адмовіць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*




Фота Надзеі БУЖАН.

Добры пачын

## Маладыя памочнікі лесу

**З 1 чэрвеня ў сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі ўпершыню пачнуць работу маладзёжныя атрады.**

Як паведамілі ў прэс-службе міністэрства, яны будуць створаны з ліку моладзі і студэнтаў для аказання дапамогі па вядзенні маніторынгу становішча ў лясах і ўдзелу ў выкананні мерапрыемстваў па папярэджанні і ліквідацыі лясных пажараў. Атрады будуць стварацца з ліку добраахвотнікаў. Ініцыятарам ідэі выступіў Мінлясгас, да яе далучыліся БРСМ, БДТУ, Мінадукацыі. Дарэчы, моладзь і раней прыцягвалася ў якасці добраахвотных памочнікаў, напрыклад летась члены школьных лясніцтваў вялі агітацыйную работу з насельніцтвам, раздавалі лістоўкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЭХ, МАЛАДАЯ!..

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»**, цёпла павітаў прысутных, падзякаваў ім, што змаглі знайсці час, каб трапіць на сустрэчу, і прадставіў удзельнікаў «круглага стала» адно аднаму, хоць гэта, хутчэй, быў крок ветлівасці: большасць з тых, хто сабраўся ў зале грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы, даўно знаёмыя па сумеснай працы. У тым ліку — і па стварэнні сённяшняга твару «Чырвонкі».

— Наш «круглы стол» прымеркаваны да 95-годдзя выхаду першага нумара «Чырвонай змены», і назвалі мы яго «Гісторыя і сучасная прастора маладзёжнай газеты». Сёння мы не толькі павіншуем адно аднаго з юбілеем камсамольскай і маладзёжнай газеты, але і пашукаем новыя трэнды. Асноўная частка гісторыі выдання звязана з камсамолам, з галоўнай маладзёжнай арганізацыяй на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Сёння яно зарэгістравана менавіта як «Чырвонка. Чырвоная змена». І ў самой гэтай назве — повязь часоў і пакаленняў. Такім чынам, што засталося ў мінулым і што запатрабавана сёння?

**Валянціна МЯШЧЭРСКАЯ, галоўны спецыяліст упраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі:**

— У маім разуменні 95 гадоў — вялікі жыццёвы адрэзак. Колькі за гэты час адбылося важных гістарычных падзей, якія змянілі лёс усёй краіны! І ва ўсіх іх моладзь прымала самы непасрэдны ўдзел.

Выхад 21 красавіка 1921 года першага нумара азначаў не проста з'яўленне новай газеты: на свет нарадзілася роданачальніца маладзёжнай прэсы Беларусі. Я з вялікім задавальненнем прачытала юбілейны нумар «Чырвонкі». Ён змяшчае столькі цікавых звестак! І вялікі дзякуй журналістам, якія робяць газету сёння, — за тое, што знайшлі супрацоўнікаў, якія стваралі «Чырвоную змену» раней. Расказалі пра невядомых літаратараў, якія гуртаваліся спачатку вакол «Красной смены», а потым «Чырвонай змены» і якія пазней сталі славутымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі. Гэта была цэлая плеяда! Добра ўяўляю сабе вечары, на якіх у 1920-я гады моладзь збіралася і спрачалася да хрыпаты наконт таго, якой павінна быць газета. І ў выніку яна была жывой, таму што ў кожны нумар укладвалася душа. Вельмі важнай падзеяй, лічу, стаў пераход газеты праз тры гады на беларускую мову.

«Чырвоная змена» і сёння захоўвае ўсе традыцыі: як раней яна не пакідала без увагі ніводзін допіс, што прыходзіў у рэдакцыю, давала пуцёўку ў жыццё тым, хто яшчэ толькі марыў стаць журналістам і пісаў у газету як юнкар, так і сёння падтрымлівае юных аўтараў, дае ім магчымасць выказацца на сваіх старонках. У журналістаў газеты ёсць выразная грамадзянская пазіцыя, яны захоўваюць найлепшая традыцыі айчыннай журналістыкі, іх матэрыялы вызначаюцца глыбінёй і актуальнасцю. «Чырвонка. Чырвоная змена» мае свой твар, што дазваляе з упэўненасцю глядзець у заўтрашні дзень.




Ганаровую грамату ад Міністэрства інфармацыі атрымлівае Сяргей Расолька.

**«Ключавая перавага газеты заключаецца ў тым, што яна выходзіць на беларускай мове. Менавіта за гэтым — будучыня».**

**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:**

— «Чырвоную змену» я памятаю яшчэ са свайго юнацтва, калі выпісваў яе школьнікам у старшых класах. Газета заўсёды была цікавай: і калі была галоўным друкаваным органам камсамола, і ў пераходныя часы, застаецца такой яна і сёння. Новае пакаленне ідзе ў нагу з часам, і «Чырвонка» ад яго не адстае.

Наша парламенцкая камісія зацікаўлена ў тым, каб у моладзі прысутнічаў пэўны маральны стрыжань. Моладзь без ідэалагічных установак існаваць не можа, таму што вакуум абавязкова запоўніцца. Але хто і чым яго запоўніць? Што гэта будзе: пазітыў ці негатыў? Пагадзіцеся, ёсць прынцыповая розніца...

Мы павінны даваць маладым людзям правільны ідэалагічны пасыл, заражаць іх, скіроўваць у правільным напрамку. І, вядома, здарова, калі гэта будзе рабіць маладзёжная газета, якой даверваюць яе чытачы.

На жаль, сёння падпіска зніжаецца на ўсе друкаваныя выданні. Ды і моладзь у асноўным жыве ў віртуальнай прасторы. Інтэрнэт-рэсурсы, якія існуюць за кошт рэкламы, моцна падрываюць тыражы. Але за сваю нішу ў інтэрнэт-прасторы абавязкова трэба змагацца. Няхай гэта будзе электронная падпіска, але падпіска платная (па гэтым шляху ідуць СМІ ў еўрапейскіх краінах). Разумею, што аднаму выданню змяніць сітуацыю не пад сілу, таму гэта павінен быць калектыўны крок з боку друкаваных СМІ.

Зычу вашаму караблю з яго моцнай прафесійнай камандай упэўнена рухацца на хвалях інфармацыі наперад і працаваць на карысць моладзі, каб яна стала падаўжальніцай цудоўных традыцый. У тым ліку і традыцый у журналістыцы. Няхай маладыя людзі, як і мы ў свой час, выхоўваюцца на такіх цудоўных газетах, як «Чырвоная змена».




Нагрудным знакам БРСМ «За поспехі ў працы» ўзнагароджаны Яраслаў Лыскавец.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Ілона НЕМАВА, начальнік аддзела арганізацыйнай работы і інфармацыі Міністэрства культуры:**

— Ад імя міністра культуры і ўсяго калектыву нашага ведамства хацелася б падзякаваць супрацоўнікам холдынга «Звязда» і газеты «Чырвонка. Чырвоная змена». Вы нашы даўнія сябры і інфармацыйныя партнёры. Зразумела, мы зацікаўлены ў тым, каб газета яшчэ больш пісала пра культурныя мерапрыемствы, тым больш у Год культуры. Мы чакаем ад журналістаў экспертных ацэнак нашых мерапрыемстваў і ўсяго таго, што робіць культурная галіна краіны.

**Таццяна ДРАПАКОВА, галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі:**

— У рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі «Чырвонка.Чырвоная змена» — наш галоўны партнёр. Усе мерапрыемствы, што рэалізоўваліся ў Год моладзі, аператыўна адлюстроўваліся на старонках газеты. Але Год моладзі ў нас не заканчваецца ніколі. Таму мы вельмі спадзяёмся і на далейшае плённае супрацоўніцтва. Упэўнены, што заўсёды можам разлічваць на дапамогу прафесіяналаў.

**Уладзімір КАСЬКО, дацэнт кафедры перыядычнага друку Інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, рэдактар газеты ў 1974 — 1981 гадах:**

— Трэба сказаць, што «Чырвонка» была найстарэйшай камсамольскай газетай ва ўсім былым СССР. Першы нумар колішняй «Красной смены» выйшаў на тры гады раней за «Комсомольскую правду». У свой час газета пабывала нават у космасе, куды быў «камандзіраваны» яе «спецыяльны карэспандэнт» Пётр Клімук. Я памятаю, як любіў і паважаў выданне Пётр Міронавіч Машэраў. Таму гэтая газета, без перабольшання, з вялікай гісторыяй. Цяжка нават уявіць, колькі спраў і пачынанняў было ініцыявана «Чырвонкай» у савецкія часы, прычым як у маштабах цэлай краіны, так і ў асобных гарадах і вёсках.

Да таго ж яна дала білет у будучыню многім беларускім пісьменнікам — ледзь не кожны класік хоць раз друкаваўся на яе старонках. Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Іван Шамякін — усе яны пачыналі ў нас.

Цяпер многія кажуць, што грамадскае абмеркаванне сыходзіць у інтэрнэт, што газеты ўжо не маюць ранейшага ўплыву на людзей. Але, на маю думку, тыя, хто аддае перавагу друкаванаму слову, заўсёды застануцца. Я дагэтуль не лічу дзень паўнавартасным, калі не пачытаю перыёдыку, у тым ліку любімыя «Звязду» і «Чырвонку». І гэта пры тым, што інтэрнэтам я таксама карыстаюся.

**Уладзімір МАКАРАЎ, начальнік упраўлення інфармацыі – прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны:**

— Хачу падкрэсліць, што Беларусь — адна з рэдкіх дзяржаў у свеце, якая не здраджвае сваёй сапраўднай гісторыі. І гэта вельмі важна, бо большасць нацый, якім даводзіцца перажыць тое, што прыйшлося нам, не выжываюць.

Пытанне ў тым, якія праблемы стаяць перад СМІ сёння. І справа не толькі ў інтэрнэце. У сувязі з імклівым развіццём інфармацыйных і іншых тэхналогій разгортваюцца два глабальныя працэсы: развіццё віртуальнай прасторы і паралельна ёй — прыход у інтэрнэт новых геніяў, у тым ліку журналістаў і пісьменнікаў. Такім чынам, сутыкнуцца два праекты: чалавецтва і нэтакратыі — улады сетак. І мы верым, што ў гэтым супрацьстаянні пераможа чалавек. Падмуркам для перамогі стане якраз наша вялікая гісторыя, у тым ліку XX стагоддзя, і не апошнюю ролю ў гэтым адыграюць такія выданні, як «Чырвонка».




«Падзякай» ад БРСМ ушанавана Надзея Бужан (злева), «Падзякай» ад Міністэрства культуры — Алена Драпко.

**Сяргей КЛІШЭВІЧ, другі сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі:**

— Далёка не кожнае выданне можа праіснаваць такі доўгі тэрмін і заспець столькі розных эпох, як гэта было з «Чырвонкай»: з'яўленне савецкай дзяржавы, Вялікая Айчынная вайна, падчас якой выхад газеты не спыняўся, пасляваенны перыяд... Ведаю гэта, бо сам пішу навуковую працу на тэму камсамольскага руху, і нядаўна знаёміўся з рарытэтнымі нумарамі газеты.

Вядома, сённяшняя «Чырвонка» — гэта ўжо далёка не тое камсамольскае выданне, якім яно было ў 1920-я гады і пазней, у савецкія часы. На наш погляд, ключавая перавага газеты заключаецца ў тым, што яна выходзіць на беларускай мове. Менавіта за гэтым — будучыня. Дарэчы, і Саюз моладзі цяпер актыўна займаецца праблемай нацыянальнага адраджэння, вяртання традыцый. Спадзяёмся, што «Чырвонка» стане своеасаблівым рупарам нашай працы ў гэтым кірунку.

І гэта не проста словы, бо мы і цяпер рэалізуем сумесны праект пад назвай «Скарбонка добрых спраў», у якім распавядаем пра дабрачынныя акцыі ўдзельнікаў нашай арганізацыі. Такім чынам спрабуем падаць прыклад астатняй моладзі. Думаю, у хуткім часе разам рэалізуем іншыя цікавыя задумы, тым больш што ў нас іх хапае.

**Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»:**

— Мне хочацца павіншаваць «Чырвонку» з днём нараджэння і, безумоўна, падзякаваць за тое, што вельмі часта ў рэдакцыі «Маладосці» раздаюцца званкі з прапановай выслаць урыўкі прозы нашых аўтараў для іх публікацыі ў маладзёжным дадатку. Рыхтаваць гэтыя фрагменты вельмі адказна, цікава і прыемна. Мы прыдумляем асаблівыя, не такія, як у часопісе, даведкі пра маладых пісьменнікаў і абавязкова паведамляем аўтарам, што іх творы трапілі не толькі ў «Маладосць», але яшчэ і ў «Чырвонку». Пэўна, мне паведамленне такой інфармацыі дастаўляе нават больш асалоды, чым самому маладому аўтару.

Я хацела б сказаць не пра інтэрнэт-прастору, а ўвогуле, пра тое, якая сёння моладзь. Адзін з аўтараў «Маладосці» напісаў: «Кажуць, сучасная моладзь ні аб чым не думае, ні да чаго не здольная. Часцей не кажуць, а крычаць. І ў большасці сваёй гэтыя крыкі не маюць пад сабой фундаменту. Людзям проста здаецца, што яны былі іншымі, што яны хацелі, яны маглі...»

Галоўнае пытанне, якое стаіць перад намі, — «пра што і як размаўляць з маладымі?» Мяркую, што для таго, каб падтрымліваць кантакт з моладдзю і мець з ёй добрыя стасункі, не трэба нічога выдумляць, трэба проста быць самімі сабой. І гаварыць, хутчэй, мовай арыгінальнай меншасці, чым стандартнай большасці. Бо маладыя сёння разбураюць вельмі многія стэрэатыпы і прымушаюць думаць пра парадаксальнае. Я лічу, што калі чытачы «Чырвонкі» і «Маладосці» так думаюць і так пішуць, то для такой моладзі можна перавярнуць горы, і мы сумесна будзем гэта рабіць.

**Наталля КАРПЕНКА, першы намеснік галоўнага рэдактара «Звязды»:**

— «Чырвоная змена» была першай газетай у маім жыцці, самай галоўнай і самай любімай — ёй я аддала амаль 20 гадоў. І цяпер хачу сказаць вялікі дзякуй усім, хто спрычыніўся да гісторыі «Чырвонкі», за тую творчую атмасферу, што заўсёды панавала ў рэдакцыі, а таксама тым, хто робіць яе сёння.

Перад правядзеннем гэтага «круглага стала» я доўга разважала над пытаннем: а што з сябе сёння ўяўляе «Чырвонка» на медыйным полі? Мы кажам, што гэта газета, у якой маладыя пішуць для маладых і пра маладых. На маю думку, выданне ў першую чаргу расказвае гісторыі тых, хто незадаволены сваёй сённяшняй планкай, хто хоча развівацца і не стаяць на месцы, хто застаецца цікаўным да жыцця. Па-другое, нашы чытачы і героі — гэта тыя, хто любіць сваю радзіму, хоча ведаць сваю гісторыю, паважае сваю мову і культуру. Па-трэцяе, гэта чулыя і міласэрныя людзі, якія дапамагаюць тым, каму сёння цяжка. Падагульняючы – гэта выданне для сучаснай, незакамплексаванай, талентанай моладзі, адкрытай свету. І, на радасць, пераважная яе большасць — менавіта такая.

**Надзея НІКАЛАЕВА,
Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*Сілуэт свята*

# НІЯКІХ МІНІ І МАКАСІНАЎ!

## У чым пайсці на выпускны

**Гэтае пытанне хвалюе старшакласнікаў, бадай, не менш, чым школьныя экзамены і цэнтралізаванае тэсціраванне. Як апранууца, каб выглядаць ярка, стылёва і каб праз пяць гадоў не было сорамна за сваё фота? У падрабязнасцях вячэрняга дрэс-кода разбіраемся з маладымі дызайнерамі брэнда Zibra Дарынай ВАДАП'ЯНАВАЙ і Аляксандрай ЖУК.**

### КАСЦЮМ — ПА ПАМЕРЫ

Пачнем з хлопцаў. Дарына раіць ім паглядзець, як апранаюцца «зоркі» на выхад, і ўзяць штосьці з гэтага сабе на заметку. Строгі дзелавы касцюм пакіньце для экзаменацыйнай камісіі, а для выпускнога лепш выбраць цікавыя колеравыя спалучэнні. Напрыклад, сіні пінжак з пясочнымі штанамі, касцюм у клетку. Калі каляровы камплект не надта падабаецца, то варыянт «тотал блэк» (цалкам чорны) таксама падыдзе.

Джынсы на такім мерапрыемстве будуць глядзецца недарэчна, гэта ўсё ж такі паўсядзённае адзенне. Ад бліскучых касцюмаў і шырокіх каралавых гальштукаў таксама адмоўцеся.

— Усё павінна гарманіраваць. Памятайце, што да кожнага каўнерыка пасуе пэўны гальштук. Рукавы кашулі мусяць выглядаць з-пад пінжака на два сантыметры. Трэба правільна падабраць памер: часта хлопцы пераацэньваюць свой аб'ём у плячах, думаюць, што яны вялікія і натрэніраваныя, — кажа Дарына.

Што да абутку, то ідэальным варыянтам будуць туфлі ці брогі (чаравікі ў дзірачкі). Ніякіх макасінаў. Красоўкі, якія цяпер модна насіць пад касцюмы, таксама не падыдуць: яны хоць і выглядаюць стыльна, але ніякага дачынення да вячэрняга дрэс-кода не маюць. Пры падборы абутку ўлічвайце колеравую гаму — нельга пад шэрыя штаны надзець карычневыя туфлі.

— Фантазію ўключаць не трэба, — раіць Дарына. — Усё ўжо за вас прыдумана. Лепш проста добра апрануцца, чым праз колькі гадоў з жахам успамінаць і саромецца свайго выгляду.


Модны варыянт — касцюм у клетку.

### ЗАБУДЗЬЦЕСЯ НА ГАРСЭТЫ

Калі казаць пра дзяўчат, дызайнеры смяюцца, што тыя звычайна дзеляцца на два лагеры: адны хочуць быць на выпускным разняволенымі і дарослымі, іншыя — стаць прынцэсамі. Апошні варыянт у прынцыпе неблагі. Пышныя спадніцы, сукенкі да падлогі ці з невялікім шлейфам заўсёды да месца на ўрачыстых мерапрыемствах. Уборы жамчужнага тону, з карункамі ці кветкавым прынтам таксама наблізяць вас да вобразу прынцэсы.


У пышнай спадніцы будзеце адчуваць сябе прынцэсай.


Сукенка да падлогі на ўрачыстых мерапрыемствах заўсёды ў тэму.

А вось ператварацца ў дарослую жанчыну і надзяваць занадта адкрытую сукенку не варта.

— Лепш, наадварот, падкрэсліць сваю свежасць і маладосць. Цяпер у модзе натуральнасць, — заўважае Аляксандра. — А стварыць сексуальнасць можна альтэрнатыўнымі метадамі, за кошт шматслойнасці, карункаў. Калі глыбокі выраз, то на спіне.

Гарсэты і міні-спадніцы — дакладна не. Папулярныя не першы сезон камбінезоны таксама пакіньце для іншага мерапрыемства: такі ўбор выглядае строга і можа прыбавіць узросту. Звярніце ўвагу на матэрыял, з якога пашыты ўбор. У сінтэтыцы ў перапоўненай актавай зале і на танцпляцоўцы будзе горача. Лепш узяць баваўну, шоўк, сацін.

Калі хочацца выглядаць арыгінальна і вылучацца сярод астатніх выпускніц, можаце паўтарыць вобраз куміра з кіно.

— Я на свой выпускны выбрала стыль Мэрылін Манро, — успамінае Аляксандра. — Было і незвычайна, і элегантна адначасова, бо гэтая жанчына ў свой час з'яўлялася іконай стылю. Перагледзіце любімы фільм, знайдзіце сукенку, падобную да той, што носіць у кадры гераіня, зрабіце такую ж прычоску і будзеце ведаць, што гэта ўдала, бо ўжо праверана.

Трэнды ж у вячэрняй модзе асабліва не змяняюцца. Прыталены сілуэт заўсёды лічыўся самым прыгожым.

— Мне здаецца, убор на выпускны мусіць быць сціплым і элегантным. Простая лёгкая сукенка з мінімальным дэкорам — найлепшы варыянт, — кажа Дарына. — А пры выбары колеру і фасону не варта прытрымлівацца нейкіх трэндаў: перавагу трэба аддаваць таму, што пасуе канкрэтна табе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# ІЛЬНЯНАЯ РАПСОДЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Лён выбрала таму, што лічыць яго найбольш практычнай тканінай. Яна і сама не ўяўляе сябе без ільнянога адзення летам. Натуральнае, зручнае, на целе яго амаль зусім не адчуваеш — другая скура, іншымі словамі. Адзін недахоп — камечыцца. Дарэчы, на калекцыю пайшоў лён... для бялізны, бо яго расфарбоўкі аказаліся больш яркімі і прыгожымі, чым для сукенак і кашуль. Адзенне рабіла ў беларускім стылі, амаль што народным. Вельмі ўдала ў яго ўпісаліся аўтарскія знаходкі.

**Калі падчас вучобы выпадае шанц паўдзельнічаць у конкурсе, лічы, пашчасціла, бо ўсе выдаткі нясе адукацыйная ўстанова.**

— Маю калекцыю можна пазнаць па маленькіх патах, якія зашпільваюцца на гузікі. Я яшчэ цалкам не выпрацавала свой стыль, але па гэтых дробязях мае мадэлі ўжо пазнаюць, — усміхаецца дзяўчына.

Кацярына любіць назіраць за працай сваіх калег, але нейкага куміра ў свеце моды ў яе няма. «Ва ўсіх калекцыях ёсць рэчы, якія мне падабаюцца, і тыя, якія я надела б не рабіла, — тлумачыць яна. — Напрыклад, мадэлі брытанскага мадэльера Віўен Вэствуд цікавыя, але іх не паносіш — яны крыху вар'яцкія. Такое можна рабіць, калі ты ўжо чагосьці дасягнуў і ёсць патрэба паэксперыментаваць для душы. Падабаецца калекцыя беларускага мадэльера Вольгі Кардаш з буслямі. Рэчы простыя, і прынт з птушкамі вельмі цікавы. Вабяць вока сукенкі Таццяны Аржанавай з Віцебска. У яе нават ёсць свая школа, дзе вучаць канструяванню. У Расіі ёсць таленавіты дызайнер Вікторыя Эфрымідзі. Ніхто з гэтых аўтараў Амерыку не адкрыў, але ў кожнага ёсць свае незвычайныя дэталі. Глядзіш на іх творчасць — і нешта сваё нараджаецца».

Сама Кацярына — прыхільніца мінімалізму. Той досвед, які яна атрымала на конкурсе, даў магчымасць паглядзець на некаторыя рэчы іншымі вачыма. «Калі я ўбачыла работы саапернікаў, зразумела, што мне шмат чаго яшчэ не хапае і трэба вучыцца і вучыцца, — прызнаецца яна. — Дагэтуль знаходжуся пад уражаннем ад сукенак адной дзяўчыны, якая выразала з тканіны нешта накшталт карунак, а затым наклала іх на адзенне. Калекцыя атрымалася вельмі арыгінальная. Я такога дакладна не магу пакуль зрабіць».

— Вось куды не пайшла б апранацца, дык гэта на рынак, — усміхаецца Каця. — Наогул з маёй прафесіяй цяжка нешта выбраць, таму што мадэль спачатку можа спадабацца, але, калі бярэш яе ў рукі, бачыш усе заганы. Таму я практычна нічога сабе не куплю. Толькі шыю. Выключэнне — джынсы. Трэба мець спецыяльнае абсталяванне і ведаць тэхналогію, каб пашыць іх па фігуры. А вось што датычыцца заводскага адзення, то тут не ўсё так сумна. Выбіралі неяк мужчынскі касцюм у мінскім універмагу і знайшлі вельмі сімпатычны ад «Камінтэрна»: і цана, і якасць падышлі. У адзення ад магілёўскай «Вяснянкі» якасць высокая, але добрыя мадэлі не даходзяць да прылаўка. Іх проста не пускаюць у масавую вытворчасць. Кажу пра гэта, таму што была там на практыцы і на свае вочы бачыла. Чаму так адбываецца, не ведаю. Магчыма таму, што масавы пашыў немэтазгодны, бо гэта дорага і патрабуецца больш часу на іх выраб.

**На калекцыю пайшоў лён... для бялізны, бо яго расфарбоўкі аказаліся больш яркімі і прыгожымі, чым для сукенак і кашуль.**


У гармоніі з прыродай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



З Наталляй Лубнеўскай

# ЗАЯЎКА ЦЕЛАМ

**Нядаўна самая вялікая мадэль plus-size Тэс Холідэй парадавала сваіх падпісчыкаў у «Інстаграме» чарговым аголеным фота. «Калі людзі кажуць, што я не магу быць мадэллю, заўсёды думаю, што гэта не самае смешнае, што са мной здарылася. Я ніколі не казала «не» ў адказ на прапановы», — напісала пад здымкам 150-кілаграмовая амерыканка. Тэс не саромеецца свайго цела і ўжо не раз пазіравала для глянцавых часопісаў. Паклоннікаў у каларытнай амерыканкі нямала: за яе жыццём сочаць 1,2 мільёна падпісчыкаў.**

Апошнім часам папулярнасць набыў рух «бодзіпазітыў». Яго прыхільніцы заклікаюць дзяўчат прыняць сябе такімі, якія ёсць, і не зважаць на прыдуманыя стандарты: яны толькі ў стрэс заганяюць. Няважна, які ў вас памер, кажуць бодзіпазітыўісткі. Насіце прыгожае і камфортнае адзенне, а свой час траціце не на дыеты і падлік калорый, а на што-небудзь сапраўды вартае.

Ідэя цудоўная, хоць і не новая. У хваравітай худнечы няма нічога здаровага. Як і ў занадта рэльефным жаночым целе. Дыеты-«сушкі» падыходзяць толькі для прафесійных бодзібілдараў і тое толькі напярэдадні спаборніцтваў, бо змяншаюць працэнт тлушчу ў арганізме ніжэй за норму.

На практыцы ж чамусьці з адной крайнасці кідаюцца ў іншую. Як з харчаваннем, калі дзяўчаты вырашаюць заўтра адмовіцца ад салодкага, смажанага і тлустага, але сёння дазваляюць сабе ўсё, што душа пажадае. Заўважылі, што мадэліплюс ужо не тыя? Калі жанчыны з формамі толькі пачыналі заваёўваць подыум, для іх таксама існавалі пэўныя стандарты. І сачыць за харчаваннем, і займацца фітнесам ім усё ж такі даводзілася.

Не падумайце, што я супраць «пышак». Я супраць ахвяр фастфуду. Не ўсе стандарты, навязаныя модай, штучна прыдуманы. Фігура «пясочны гадзіннік» нездарма лічыцца самай прывабнай: з пункту гледжання медыцыны, гэты тып фігуры яшчэ і самы здаровы. Выразна акрэсленая талія павінна быць, бо лішнія кілаграмы на жываце небяспечныя. Тлушч назапашваецца вакол унутраных органаў, што можа павысіць рызыку шэрагу захворванняў (напрыклад, развіцця цукровага дыябету). Медыкі прыводзяць розныя лічбы, але ў сярэднім, калі аб'ём вашай таліі перавышае 85 сантыметраў, гэта сігнал задумацца і нешта змяніць у сваіх звычках.

Здаецца, што часам бодзіпазітывам прыкрываюцца тыя, хто проста лянуецца сачыць за сабой. Маўляў, нарэшце з'явіўся трэнд, які дазваляе расслабіцца. І чамусьці ўпускаюць з віду, што бодзіпазітыў прапагандуе яшчэ і здаровыя адносіны да свайго цела. Сумна, калі добрую ідэю даводзяць да абсурду.

Кагосьці натхняе прыклад «пышкі» Тэс, а асабіста мне больш падабаецца іншая гісторыя. Яна таксама пра дзяўчыну ў целе, 169-кілаграмовую Сімону Андэрсан з Новай Зеландыі. Столькі гэтая лэдзі важыла два гады таму. А потым ёй надакучыла хлусіць сабе, што яе ўсё задавальняе. (Ведаеце папулярную адгаворку пра тое, што не ты тоўсты, а косці цяжкія? Забудзьцеся на гэты аргумент. Шкілет чалавека важыць 7-10 кілаграмаў, таму нават не спрабуйце прыпісаць яму больш.) «Пышка» вырашыла змяніцца кардынальна. На працягу ўсяго працэсу пахудзення Сімона фатаграфавала сябе і выкладвала гэтыя здымкі ў сацыяльныя сеткі, чым выклікала вялікую цікавасць да сябе. 150 тысяч чалавек сачылі за зменамі Сімоны, што, пэўна, матывавала яе працаваць яшчэ больш старанна. Прыгажуня змагла пазбавіцца ад 100 кілаграмаў! Цяпер новазеландка з гонарам выкладае свае фота «да» і «пасля» і кансультуе дзяўчат па здаровым харчаванні і трэніроўках.

**Два гады таму на базе нашай школы была створана дзіцячая тэлестудыя «МЫ». Куратарам і рэжысёрам нашага клуба з'яўляецца Вольга Казіміраўна Піскун, апературам — Віктар Аляксандравіч Цырулік. На занятках мы вучымся, як правільна гаварыць і паводзіць сябе на камеру, напісанню тэкстаў, праваздненню трэнінгаў, робім кліпы, рознага кшталту прэзентацыі. Дзякуючы дзіцячай тэлестудыі моладзь знаёміцца не толькі з асновамі журналісцкай дзейнасці, фота- і відэаздымак, але і акцёрскага майстэрства, вучыцца быць больш упэўненай у сабе.**



У кастрычніку 2014 года нам быў прысвоены статус клуба ЮНЕСКА. Асноўная мэта такіх клубаў — сваёй дзейнасцю прыносіць карысць сабе і Радзіме. Стаць іх членамі могуць не толькі навучэнцы школы, але і моладзь да 31 года. У рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» сёння ўваходзяць 60 клубаў. Нягледзячы на тое, што наш — адзін з малодшых, мы ўжо годна заявілі пра сябе! За два гады прынялі ўдзел у чатырох фестывалях клубаў ЮНЕСКА — у міжнародным «Жывая вада дружбы» (Гомель), у рэспубліканскіх (Гродна і Масты), а таксама ў рэспубліканскім зімнім універсітэце клубаў ЮНЕСКА (Гомель), пяцідзённых курсах лідэрства і трэнераў трэнінгаў (Слуцк). На фестывалях збіраецца да двухсот удзельнікаў з розных куткоў краіны, кожная каманда прадстаўляе не толькі свой клуб, але і свой горад. Моладзь выконвае розныя заданні інтэлектуальнага і культурнага характару, наведвае трэнінгі і майстар-класы для павышэння сваіх ведаў і ўменняў у той ці іншай сферы.

Нам не ўсё роўна, што адбываецца ў нашай краіне і за яе мяжамі. Нам ёсць чым ганарыцца, і пра тое мы павінны гаварыць! Аб гэтым сведчаць нашы сюжэты — «Шлях да перамогі», «Настаўнік будучыні: хто ён?» і іншыя. Мы не былі абыякавымі і да ваенных дзеянняў на Украіне, знялі сюжэт «Гэтае жудаснае слова — вайна...» пра маці з дзіцем, якія былі вымушаны бегчы з Украіны, і заклікам да дарослых «Спыніце вайну!». За два гады ў нас тры першыя і два другія месцы ў рэспубліканскіх конкурсах відэасюжэтаў.

Куратар клуба Вольга Казіміраўна Піскун напрыканцы мінулага навучальнага года выступіла з ініцыятывай зняць дакументальны фільм пра кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. І гэта ў нас бліскуча атрымалася. Фільм стаў здабыткам не толькі нашага клуба, але і ўсёй Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА.

Дзякуючы тэлестудыі мы пазнаём гісторыю сваёй краіны, вучымся быць адказнымі за свае ўчынкі, усміхаемся, развіваемся. І — нашы мары ажыццяўляюцца!

**Кацярына НАВАЖЫЛАВА,**
**вучаніца 7 класа СШ №16**
**г. Мазыра.**

**ПРА АЎТАРА**

Каця — самая юная ўдзельніца нашага сёлетняга конкурсу, ёй 13 гадоў.

— Захапляюся танцамі, займалася ў дзіцячым узорным ансамблі «Мазырскія весялушкі», з'яўляюся членам клуба ЮНЕСКА «МЫ», дзіцячай тэлестудыі. Мару стаць журналістам, — кажа пра сябе аўтарка. — Маё жыццёвае крэда: не словам, а справай даказваць сваю праўду – не разважаць, а рабіць.

SEX-БАЛЯСЫ

# ПРАЕКЦЫІ ЖАДАННЯЎ

**Вось і адгрымела і ўжо амаль забылася сёлетняе «Еўрабачанне». Для нас яно традыцыйна было прадказальным: і непасрэдна па ўдзеле, і па выніку. Што тычыцца апошняга, зноў пасля конкурсу загучала знаёмае: маўляў, не трэба так сур'ёзна ставіцца да гэтага песеннага форуму і насіцца з ім як з пісанай торбай. Згодны з гэтым меркаваннем. Як нехта заўважыў, згаданы конкурс (калі адкінуць палітычны складнік) — у пэўным сэнсе кагал фрыкаў. І вось тут мы маглі пра сябе заявіць! Голы выканаўца, вакол ваўкі... Шкада, але зноў жа прадказальна нічога не атрымалася. Зразумела, што выканаўцу «ў чым маці нарадзіла» на сцэну ніхто не выпусціў бы, гэта быў усяго толькі піяр-ход, да таго ж, на мой суб'ектыўны погляд, першапачаткова не зусім перакананча разыграны. («Пара падымаецца ў кватэру. Хлопец спрабуе адчыніць дзверы і ўсё ніяк не можа патрапіць ключом у замок. «Т-а-а-к, добры пачатак» — паназіраўшы за патугамі, змрочна кажа дзяўчына»). Карацей, абышліся праекцыяй на экране. Ну, хаця б так...**

Гэты крок нагадвае мне вынікі розных навуковых даследаванняў, якія рэгулярна з'яўляюцца ў доступе. Яны такія ж відавочныя і прадказальныя. («Брытанскія вучоныя даказалі, што кошкі размнажаюцца нашмат лепш, калі ім не перашкаджаюць брытанскія вучоныя»). Напрыклад, у аўтарытэтным амерыканскім псіхалагічным часопісе было апублікавана цікавае даследаванне. Згодна з ім, людзі, з якімі здарылася нешта, што прымусіла іх трывожыцца, з большай верагоднасцю заказаюцца адно ў аднаго. («Убачыў сваю былую з іншым, і маё сэрца сціснулася. А потым расціснулася. Яно так працуе, былая тут не пры чым»). Адчуванне трывогі, сцвярджае аўтар даследавання, павялічвае не толькі нашу здольнасць закахацца, але і нашу прывабнасць. («Парада дзяўчыне: калі мужчына, які табе падабаецца, не заўважае цябе, пазыч у яго шмат грошай. Няхай толькі пра цябе і думае»).

**Далей — болей.
«А рэгулярнае абмацванне гэтай часткі жаночага цела ўвогуле вядзе да бессмяротнасці!»
Ну, і жарты пра Дункана Маклаўда...**

Яшчэ адзін прафесар з Ельскага ўніверсітэта правёў эксперымент і высветліў, што калі чалавек чуе цёплыя словы, скажам, «добры», «мілы», «мяккі», ён пачынае адчуваць такія ж цёплыя пачуцці да таго, хто гэтыя словы вымаўляе. («Выйдзеш за мяне?» — «У якую змену?»). Навуковец сцвярджае, што той жа эфект спрацоўвае, калі вы частуеце некага цёплымі напоямі. Чалавек, якому вы налілі кубак кавы, аўтаматычна пачынае адчуваць да вас сімпатыю. («Хударэо... Прыгатавала на вячэру маркоўныя катлеты. Муж смяецца і просіць на заўтра зрабіць адбіўныя з кропу»). Прафесар даводзіць, што метад працуе толькі з цёплымі напоямі. Маўляў, прахаладжальны ў спякотны дзень ад вас прымусіць з удзячнасцю, але на развіццё адносін разлічваць асабліва не варта. («Зразумей, справа не ў табе, справа ўва мне! Я ідэальная, а ты — так сабе!»). Хоць адкуль такія вынікі атрымаліся?

А нямецкія вучоныя нядаўна даказалі, што разглядванне аголеных жаночых грудзей сур'ёзна падаўжае мужчынам жыццё. Даследчыкі распавялі, што ўсяго дзесяць хвілін такой тэрапіі адпавядаюць паўгадзіннай трэніроўцы па аэробіцы. Ад разглядвання прыгожых формаў (аказваецца!) у мужчын паляпшаецца работа сардэчна-сасудзістай сістэмы («У мужчын сэрца — не адзіны орган, якому не загадаеш»), а таксама павялічваецца прыток крыві і кіслароду да тканак арганізма («Мне здаецца, што ты няроўна дыхаеш у мой бок» — «Юля, не накручвай сябе, я, астматык, аддай інгалятар»). Вучоныя сцвярджаюць: штодзённае разглядванне аголеных жаночых грудзей можа на 50 працэнтаў знізіць рызыку інфаркту і інсульту, а таксама на пяць-сем гадоў падоўжыць жыццё мужчыну. Вы здагадваецеся, што пачалося пасля апублікавання вынікаў гэтага даследавання? Тут жа з боку моцнай паловы чалавецтва пасыпаліся радасныя каментарыі кшталту: «Я ведаў!», «Я здагадваўся!». Далей — болей. «А рэгулярнае абмацванне гэтай часткі жаночага цела ўвогуле вядзе да бессмяротнасці!» Ну, і жарты пра Дункана Маклаўда...

А адна амерыканская кампанія па продажы брэндавай споднай бялізны не стала праводзіць тэарэтычных даследаванняў, а адразу ўвасобіла іх у жыццё. За два гады аб'ёмы рэалізацыі розных прадметаў жаночага інтымнага гардэроба павялічыліся на 20 працэнтаў пасля таго, як кампанія адмовілася ад


Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

выкарыстання фотошопу ў рэкламе сваёй прадукцыі. На рэкламных здымках былі адлюстраваны як дзяўчаты з лішняй вагой ці татуіроўкамі, так і мадэлі, у якіх з-за абранай позы жывот ці іншыя часткі цела выглядалі неідэальна. Вытворцы не ўтойвалі, што над прафесійнымі мадэлямі папрацавалі візажысты і стылісты, хоць рэкламныя фота і суправаджаліся надпісамі кшталту «Любі мяне, а не рэтушуй». А дзяўчатам канцэпцыя спадабалася, яны падтрымалі яе, выклаўшы ў сеціве больш за 30 тысяч фотаздымкаў саміх сябе ў бялізне гэтага брэнда! І няцяжка здагадацца, чаму: вобраз мадэляў стаў ім крышачку бліжэйшы, бо яны «прымервалі» яго на сябе. («Мне мой гаворыць: «Чаго ты такая худая? Ідзі торт з'еш!» — «А твой... гэта хто?» — «Ну... унутраны голас»). Гаворка пра тую самую праекцыю, праекцыю нашых жаданняў. («Я, праўда, не ідэал, але і ты не смажаная бульбачка»).

Напрыканцы, карыстаючыся выпадкам, застаецца толькі выказаць уласнае пажаданне-праекцыю. «Дзяўчына павінна быць прыгожай да непрыстойнасці... А таксама падчас непрыстойнасці і пасля непрыстойнасці».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Музыка — на першым месцы»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Быць артыстам кавер-бэнда для музыкантаў — гэта хлеб ці творчасць?***

— Ёсць прыклады артыстаў, якія і ў выкананні кавер-версій праяўляюць творчасць: прыдумляюць свае аранжыроўкі, эксперыментуюць з формай, рытмам, іншыя ж ставяць мэту — выконваць песні максімальна блізка да арыгінала. І кожны мае рацыю, бо музыка — гэта не толькі ноты, а тое, як кампазіцыя падаецца слухачам.

**«Быў час, калі паралельна супрацоўнічаў з пяццю калектывамі. Мой графік, які складаўся з рэпетыцый і канцэртаў, быў распісаны па гадзінах на тыдні наперад, а адчуваў я сябе пры гэтым выдатна».**

Іншая справа, што рабіць каверверсіі і выконваць іх лягчэй, бо іх людзі ведаюць і любяць. Іншымі словамі, ты прымяраеш на сябе касцюм, у якім ужо першапачаткова падабаешся публіцы. І потым давядзецца зрабіць вялікі крук, каб дабіцца такога ж інтарэсу ўжо ўласна да сваёй творчасці. Таму ёсць пэўная рызыка, калі адважваешся пісаць сваю музыку. Але я малады і магу сабе дазволіць шукаць і спрабаваць сваё.

***— Сёлета было некалькі артыстаў з Беларусі на «Голасе краіны». Вам удалося прайсці там не адзін этап. Раскажыце пра закулісе шоу.***

— Я на гэтым конкурсе адчуваў сябе, нібы на адпачынку. Як у летніку, дзе ёсць групы па інтарэсах і педагогі. За пару месяцаў на праекце я адкрыў для сябе шмат новага, пачынаючы з працы над сваёй манерай выканання і заканчваючы ўспрыманнем музыкі ўвогуле. Там прысутнічала саперніцтва, але яно спрыяла таму, каб імкнуцца быць першым.

***— Скажыце, якія адчуванні, калі знаходзішся ў сітуацыі, дзе невядома, ці выберуць цябе сярод іншых?***

— Ведаеце, пасля таго як я не прайшоў адбор на расійскі «Голас», то не расчараваўся, а наадварот разазлаваўся на сябе і пачаў працаваць з большай стараннасцю. І ўсё атрымалася з другой спробы ў Кіеве. Этап сляпых праслухоўванняў на «Голасе краіны» быў самым складаным. Заўсёды не проста іграць перад музыкантамі, а калі гэта конкурс і табе трэба разварнуць спіны масцітых майстроў, то адчуваеш псіхалагічны дыскамфорт. Бо не маеш візуальнага кантакту — а значыць не можаш падстроіцца пад рэакцыю гледача і выйсці на жаданы яму вынік. І вось імгненне, калі да цябе павярнуліся настаўнікі — гэта прызнанне, якое дае табе ўпэўненасць у самім сабе і ў тым, што ты маеш права быць артыстам.

**«Ёсць пэўная рызыка, калі адважваешся пісаць сваю музыку. Але я малады і магу сабе дазволіць шукаць і спрабаваць сваё».**

***— Ян, за пяць гадоў, што вы знаходзіцеся сярод музыкантаў, можаце вызначыць, чаго больш у прафесіі артыста — плюсоў ці мінусаў?***

— Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека і яго пасылу ў творчасці. Дапусцім, калі іграеш у рок-групе, то гэтаму вобразу трэба адпавядаць не толькі на сцэне... А вось што тычыцца сямейнага жыцця, то тут адноўчы можа паўстаць пытанне: чым ты гатовы ахвяраваць? Здараецца ж, многія гурты распадаюцца пасля таго, як музыканты сталеюць і ў іх з'яўляюцца сем'і. Я пакуль выбіраю музыку і не нацэлены на сур'ёзныя адносіны, бо разумею: быць артыстам — значыць часцей сябе пазбаўляць, каб больш зрабіць!

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*



Ведай нашых!

# IOWA лепш за «Віа Гру»

**Беларускае трыа IOWA названа «Групай года» ў Расіі. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным сайце гурта. Каманда выйграла, пакінуўшы ззаду такія калектывы, як «Віа Гра», Serebro, Mband і Quest Pistols Show.**

Узнагародамі ў гэтым годзе таксама былі адзначаны Ёлка («Лепшая спявачка»), Сяргей Лазараў («Лепшы спявак»), Аляксей Вараб'ёў («Лепшы відэакліп») і іншыя артысты. Цырымонія праходзіла ў шматтысячным маскоўскім зале Crocus City Hall. Вялі яе Вера Брэжнева, Філіп Кіркораў, Алена Север і Андрэй Малахаў.

Не абышлося без казусаў: калі гурт IOWA адкрываў цырымонію з песняй «Б'е біт», гукарэжысёры забыліся ўключыць мікрафон вакалісткі Каці Іванчыкавай. У выніку першую палову песні яна проста танчыла пад музыку, а спявалі за яе тысячы гледачоў, уключаючы знакамітых гасцей цырымоніі. Затое так усе змаглі пераканацца, што вакалістка гурта не працуе пад фанаграму. Акрамя таго, гурт IOWA прадставіў новы кліп на песню «140» — трэці сінгл з новага альбома, выхад якога прызначаны на лістапад. Здымкі кліпа доўжыліся амаль 25 гадзін без перапынку ў адным з павільёнаў Санкт-Пецярбурга. Гэта відэа — першая сумесная праца групы і рэжысёра Вікторыі Паповай.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.023.
Нумар падпісаны ў 19.30 01.06.2016 г.

# ПРЫЦЯГНЕННЕ ТУМАННАГА ЧУНЦЫНА

## Чым прываблівае самы вялікі мегаполіс свету?



**Апошнім часам усё больш людзей у свеце аддаюць перавагу жыццю ў гарадах. Паводле розных ацэнак, цяпер тут «прапісалася» каля паловы насельніцтва планеты. Пры гэтым агульная плошча гарадоў свету не такая ўжо і вялікая — крыху больш за 1% тэрыторыі сушы. Сучасная ўрбанізацыя пачалася параўнальна нядаўна — у сярэдзіне ХХ стагоддзя. Гэты працэс асабліва закрануў краіны, якія развіваюцца. Урбанізацыя характарызуецца ростам не толькі колькасці насельніцтва, але і разрастаннем гарадоў, фарміраваннем вялікіх агламерацый. Гэта прыводзіць да таго, што сучасныя мегаполісы дасягаюць проста каласальных памераў. Самым вялікім па плошчы лічыцца кітайскі Чунцын, які займае 82,4 тысячы кв. км, — супастаўна з тэрыторыяй Аўстрыі. Тут сёння больш за 32 млн жыхароў! Гэта, зразумела, без уліку шматлікіх турыстаў. Акрамя таго, згодна са статыстыкай, штодня насельніцтва павялічваецца на 1,3 тыс. чалавек. Чым прываблівае Чунцын?**

### Сталіца царства Ба

Паводле звестак ААН, колькасць гарадоў у Кітаі з мільённым насельніцтвам падскочыла з 16 ў 1970 годзе да 106 у 2015-м. Для параўнання: у ЗША цяпер 45 мегаполісаў з больш чым мільённым насельніцтвам, у Еўропе іх каля 55. Самы вялікі горад у свеце Чунцын расцягнуўся ў даўжыню на 470 км (з усходу на захад) і ў шырыню на 450 км (з поўначы на поўдзень). Уяўляеце?! Гэта адзін з самых старажытных гарадоў Паднябеснай — яго гісторыя налічвае больш за 3 тысячы гадоў. Як сведчаць даныя археалагічных раскопак, 20-30 тыс. гадоў таму — у эпоху позняга палеаліту — у гэтых мясцінах ужо пасяліліся першабытныя людзі. Гэта зусім не дзіўна, бо менавіта тут рака Цзялінцзян упадае ў Янцзы, а на захад ад горада распасціраецца Чырвоны басейн — сапраўдная жытніца Кітая. Апроч іншага, горад, як прыроднай сцяной, акружаны трыма горнымі масівамі: Дабашань — на поўначы, Ушан — на ўсходзе і Далушань — на поўдні.

Калісьці тут знаходзілася паўлегендарнае царства Ба (тады горад насіў назву Цзянчжоу), затым — правінцыя Юй (дарэчы, такім іерогліфам дагэтуль пазначаюць горад на аўтамабільных нумарах). Назва «Чунцын» даслоўна перакладаецца як «двайное святкаванне». На гэты конт існуе фактычна задакументаванае тлумачэнне. У 1189 годзе прынц Сунскай дынастыі Чжаа Дунь быў узведзены ў сан князя Гун-ван і атрымаў у кіраванне правінцыю Гун. Пазней заняў імператарскі трон. З гэтай нагоды ён казаў, што «двойчы святкаваў узвядзенне ў сан: спачатку ў сан князя Гуан-ван, а потым — у імператарскае званне».




Пры дынастыях Мін і Цын (1368 — 1911) Чунцын стаў важным транспартным вузлом для гандлёвых караванаў. З 1891-га гэта адкрыты порт, дзе была абсталявана мытня. З таго часу назіраўся росквіт судназходства. Адсюль, зразумела, станоўчыя зрухі ў гандлі, фінансавай справе і перапрацоўчай прамысловасці. Паступова ён стаў вузлавым пунктам, які злучае Паўднёвы Захад Кітая і вярхоўе Янцзы са знешнім светам.

У 1929 годзе Чунцын афіцыйна быў нададзены статус горада. У 1940 – 1946 гадах горад становіцца «другой сталіцай» Паднябеснай, фактычна з'яўляючыся цэнтрам палітычнай, эканамічнай, гандлёвай, культурнай і знешнепалітычнай дзейнасці, а таксама камунікацыйным цэнтрам. 14 сакавіка 1997 года 2720 дэпутатаў Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў амаль аднадушна прагаласавалі за наданне Чунцыну статусу горада цэнтральнага падпарадкавання. Такім чынам, ён стаў чацвёртым (пасля Пекіна, Шанхая і Цяньцзіня) горадам Кітая, якія непасрэдна падпарадкоўваюцца цэнтральнаму ўраду.

### На ўзбярэжжы Янцзы

Чунцын адміністрацыйна падзяляецца на 19 раёнаў і 15 паветаў. Рэгіён багаты на карысныя выкапні, ужо разведана 38 іх галоўных відаў, сярод якіх — вугаль, прыродны газ, стронцый, баксіты, марганец, мармур, шпат, гіпс, кварцыт, ртуць, каменная соль. У прыватнасці, па запасах стронцыю горад займае першае месца ў Кітаі і другое месца ў свеце. Гэта адзін з трох буйных рэгіёнаў краіны па рэсурсах падземных водных крыніц.

Чунцын — адзін з найважнейшых гандлёвых і прамысловых, камерцыйных цэнтраў Паднябеснай. Горад раскінуўся на берагах Янцзы ў 2500 км на захад ад Шанхая. Гэта ідэальнае месца для выхаду на рынкі цэнтральных раёнаў Кітая, пакуль яшчэ недастаткова развітых. Раней замежных інвестараў адпужваў дрэнны стан дарог. Цяпер, дзякуючы развітой транспартнай інфраструктуры, сітуацыя змянілася. Чыгунка звязвае горад з Чэнду, правінцыямі Сычуань і Хунань. Таксама развіта сетка аўтамагістраляў; тут знаходзіцца найбуйнейшая прыстань у верхнім працягу Янцзы. Рух таксама магчымы і па рацэ Цзялінцзян. У даліне Янцзы з'явілася велічэзнае рукатворнае возера працягласцю 600 км і плошчай больш за тысячу кв.км. Гэта дало магчымасць вялікім суднам падыходзіць да гарадскога порта.

Аэрапорт «Цзянбей» знаходзіцца ў паўднёва-заходняй частцы горада. Чыгунка Чунцын — Сіньцзян — Еўропа бярэ пачатак у Чунцыне, праходзіць праз гарады Сіянь, Ланьчжоу, Урумчы, перасякае Казахстан, Расію, Беларусь, Польшчу, заканчваючыся ў нямецкім партовым горадзе Дуйсбург. Увесь шлях — 11 тыс. кіламетраў — займае 16 дзён, што значна хутчэй, чым па моры, і танней, чым па паветры. Так што Чунцыну паступова ўдаецца перавабліваць замежных інвестараў з больш даступных прыбярэжных раёнаў. Цяпер тут знаходзіцца звыш 2 тыс. замежных прадпрыемстваў.



Прамысловасць Чунцына ў апошнія гады развіваецца хуткімі тэмпамі. Апорныя галіны — хімічная, машынабудаўнічая і металургічная. Чунцын разам з гарадамі Шанхай, Чанчунь і Шыянь з'яўляецца найбуйнейшай базай па вытворчасці аўтамабіляў Кітая. Тут 5 заводаў па выпуску аўтамабіляў і больш за 400 заводаў па вытворчасці аўтамабільных дэталяў. Гадавы аб'ём — 200 тыс. аўтамабіляў і 3 млн матацыклаў.

У Чунцыне тры буйныя металургічныя прадпрыемствы. Горад з'яўляецца адной з 6 баз хімічнай прамысловасці Кітая. Актыўна праводзіцца рэструктурызацыя ключавых галін, такіх як аўтамабільная, хімічная і фармацэўтычная прамысловасць. Шматлікія ваенныя заводы, створаныя пасля 1949 года і стратэгічна важныя ў свой час, цяпер страцілі канкурэнтаздольнасць і ў выніку канверсіі пераарыентуюцца на выпуск цывільнай прадукцыі. Асновай буйной прамысловасці з'яўляецца прагрэсіўная навука. У Чунцыне звыш тысячы навукова-даследчых інстытутаў, дзе працуюць больш за 560 тыс. спецыялістаў. У горадзе налічваецца 43 ВНУ, у якіх навучаюцца больш за 100 тыс. студэнтаў.

Улады горада робяць актыўныя захады па ўрбанізацыі рэгіёна: за кошт дзяржаўных сродкаў вядзецца будаўніцтва магістраляў, ствараецца гарадская інфраструктура на ўсёй тэрыторыі муніцыпальнага ўтварэння. Самы папулярны від гарадскога транспарту — метро. Гэта чатыры лініі (чырвоная, зялёная, сіняя, ружовая), 119 станцый, агульная працягласць — больш за 210 кіламетраў. Плануецца, што ўжо да 2017 года ў горадзе з'явіцца яшчэ тры лініі метро. Яны працягнуцца на 90 кіламетраў.

### Горны «гусак»

Легендарная гісторыя, дынамічная сучаснасць, але не варта таксама забываць пра тое, што Чунцын — прыгожы і рамантычны. Цэнтр горада размешчаны на горным хрыбце ў форме паўвострава. З-за адпаведнага ландшафту мясцовасці яго празвалі «горным горадам» (Шаньчэн). Да таго ж гэта адно з нямногіх паселішчаў Кітая, дзе колькасць ровараў нязначная. Амплітуда вышынь складае каля 220 метраў. Калі зірнуць на горад з берага ракі, то можна ўбачыць, як велізарныя будынкі цягнуцца да небасхілу. Калі забраца вышэй, то перад вачыма паўстануць горныя пікі.

Рэкі падзяляюць горад на тры часткі (яго таксама называюць і «горадам рэк»). Здалёку Чунцын нагадвае гусака, які лунае над вадой. У сонечныя дні будынкі, якія адлюстроўваюцца ў вадзе, надаюць чароўнасць пейзажу. Асабліва прыгожы выгляд мае начны Чунцын, калі пагоркі расквечваюцца шматлікімі агнямі жылых дамоў, а зверху над імі перакульваецца цёмны купал неба, мігатлівыя зоркі якога нібы ўступаюць у спаборніцтва з зямной ілюмінацыяй.

Клімат Чунцына вельмі своеасаблівы — часта горад ахінуты густым туманам, праз які спрабуюць прабіцца сонечныя прамяні. Багатая субтрапічная расліннасць не мяняе свайго колеру ў залежнасці ад сезона, з-за чаго здаецца, што час у Чунцыне спыніўся. Яшчэ адна адметнасць — вялікая колькасць ападкаў. Прычым дажджы ідуць пераважна ўначы (ёсць нават крылаты выраз «начны дождж у гарах Ба»). У паўночным і паўднёвым прадмесцях горада знойдзеце цёплыя крыніцы. Калі паехаць у больш аддаленыя раёны, то трапіш у джунглі альбо ў «каменны лес», ва Улунскія пячоры, на высакагорныя лугі і іншыя маляўнічыя мясціны.

Дзве асабліва каларытныя чунцынскія прафесіі — банбан (насільшчык з тоўстай трысняговай палкай, які дапамагае данесці цяжкія рэчы) і модзі (матацыклетны таксіст, які заязджае туды, куды не дабярэцца звычайны аўтамабіль). Цікава, што чунцынцы не ўяўляюць сваё жыццё без вострай ежы. Яны адрозніваюць некалькі відаў вастрыні, якія атрымліваюцца з дапамогай розных спецый. Тут у «рулетку» гуляць не варта — можна лёгка «анестэзаваць» рот, ды так, што не ўздыхнуць. Таксама будзьце ўважлівыя і з «хога» (так званы «кітайскі самавар») — яшчэ адна тутэйшая кулінарная адметнасць. Гэта калі ў булёне ці алеі вы самастойна варыце дробна і тонка накрышаныя мяса, рыбу, іншыя морапрадукты ды шмат чаго яшчэ...

Вось такі сёння самы вялікі і самы загадкавы мегаполіс свету. Старажытны, сучасны, субтрапічны, рознакаляровы, для кожнага — свой. І гэта дакладна адно з тых месцаў, якое вы не забудзеце. Паколькі туманны Чунцын, быццам містычны прывід вуду (параўнанне, што называецца, ад жыцця: некалькі дзён, праведзеных у мегаполісе, я жыў у гатэлі «Wudu»), будзе зноў і зноў вяртацца да вас. І абуджаць самыя рамантычныя ўспаміны.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | капитальное строение, инв. № 420/С–41618 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально–технического снабжения, хранилищ, наименование – приемный пункт стеклопосуды), площадью 122,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Советская, 23В |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | кадастровый номер 441300000007000401 (назначение – земельный участок для обслуживания пункта приема стеклотары), площадью 0,0402, расположенный по адресу: г. Лида, ул. Советская, 23В |
| **Начальная цена продажи** | 388 509 457 (триста восемьдесят восемь миллионов пятьсот девять тысяч четыреста пятьдесят семь) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 38 850 946 (тридцать восемь миллионов восемьсот пятьдесят тысяч девятьсот сорок шесть) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1 % от конечной цены продажи объекта |
| **Продавец** | ОАО «Торгово–производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел.: 45–05–38, 41–98–32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли–продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 05 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно–финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 30 июня 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45–05–38, 41–98–32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**(Организатор аукциона)**

**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/ 40, принадлежащего ОАО «Минский завод строительных материалов» (Продавец):**

Лот № 1 – здание – участок плит с инв. № 500/С–16434. Начальная цена с НДС – 4 743 941 400 бел. руб. Задаток – 300 000 000 бел. руб.

Аренда: – часть Лота №1 сдается по договору аренды до 31.01.2017 (площадь, сдаваемая в аренду 27,58 кв.м); – часть Лота №1 сдается по договору аренды до 01.01.2017 (площадь, сдаваемая в аренду 19,4 кв.м); – часть Лота №1 сдается по договору аренды до 08.09.2016 (площадь, сдаваемая в аренду 44 кв.м).

Земельный участок площадью 16,4942 га с кадастровым номером 500000000006004362. На земельном участке располагаются иные объекты, не выставленные на аукцион.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС–Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Минский завод строительных материалов» (Лот № 1), проводимом 15 июня 2016 г.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли–продажи в течение 10 (десяти) дней после подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли–продажи.

Если между Продавцом и Победителем аукциона (Претендентом на покупку) в течение срока, установленного для подписания договора купли–продажи, не достигнута договоренность о сроках и порядке оплаты за Лот №1, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 2 % (Двух процентов) от цены продажи Лота №1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Обязанность по оформлению всех документов, связанных с регистрацией сделки купли–продажи Лота №1, оформлению прав собственности на Лот №1 и оплате связанных с этим расходов возлагается на Победителя аукциона (Претендента на покупку).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 15.06.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.06.2016 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.** Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.02.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306–00–57, 8(029) 356–90–03, 8(029) 550–09–52 • www.ino.by • e–mail: torgi@ino.by**

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

Годовая консолидированная финансовая отчетность банка за период с 1 января по 31 декабря 2015 года в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: **www.vtb-bank.by.** УНП 101165625.

### Консолидированный отчет о финансовом положении На 31 декабря 2015 года

(в миллионах белорусских рублей, если не указано иное)

| | Прим. | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 6 | 1 852 468 | 1 221 926 |
| Средства в кредитных организациях | 7 | 473 042 | 48 576 |
| Производные финансовые активы | 8 | 1 091 328 | 1 918 568 |
| Кредиты клиентам | 9 | 8 310 449 | 6 263 206 |
| Активы, предназначенные для продажи | 10 | 25 372 | 28 627 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 11 | 1 684 092 | 2 |
| Основные средства | 12 | 586 259 | 459 613 |
| Нематериальные активы | 13 | 42 246 | 36 653 |
| Предоплата по налогу на прибыль | | 15 025 | 18 010 |
| Прочие активы | 16 | 75 922 | 57 242 |
| **Итого активы** | | **14 156 203** | **10 052 423** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства НБРБ | 17 | 286 408 | - |
| Средства кредитных организаций | 18 | 2 575 290 | 3 303 322 |
| Средства клиентов | 19 | 8 052 509 | 4 528 998 |
| Обязательства по финансовой аренде | 20 | 75 851 | 53 590 |
| Производные финансовые обязательства | 8 | 525 | 5 963 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 20 | 289 171 | 72 711 |
| Резервы | 15 | 76 378 | 1 051 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | | - | - |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 14 | 145 329 | 25 004 |
| Прочие обязательства | 16 | 107 592 | 90 359 |
| Субординированные займы | 22 | 641 934 | 421 379 |
| **Итого обязательства** | | **12 250 987** | **8 502 377** |
| **Капитал** | | | |
| Уставный капитал | 23 | 1 270 993 | 1 270 993 |
| Эмиссионный доход | | 192 559 | 192 559 |
| Нераспределенная прибыль / (Накопленный дефицит) | | 339 651 | 60 873 |
| Фонд переоценки основных средств | | 102 013 | 25 621 |
| **Итого капитал** | | **1 905 216** | **1 550 046** |
| **Итого капитал и обязательства** | | **14 156 203** | **10 052 423** |

### Консолидированный отчет о прибылях и убытках За год, закончившийся 31 декабря 2015 года

(в миллионах белорусских рублей, если не указано иное)

| | Прим. | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | | |
| Кредиты клиентам | | 1 806 600 | 1 372 507 |
| Средства в кредитных организациях | | 49 784 | 17 514 |
| Инвестиционные ценные бумаги | | 31 774 | 4 308 |
| | | **1 888 158** | **1 394 329** |
| **Процентные расходы** | | | |
| Средства НБРБ | | (32 698) | - |
| Средства кредитных организаций | | (220 748) | (198 810) |
| Средства клиентов | | (663 771) | (455 606) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | | (6 876) | (2 569) |
| Обязательства по финансовой аренде | | (34 593) | (28 207) |
| Субординированные займы | | (37 283) | (23 260) |
| | | **(995 969)** | **(708 452)** |
| **Чистый процентный доход** | | **892 189** | **685 877** |
| Резерв под обесценение кредитов | 7 9 | (414 866) | (146 728) |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | | **477 323** | **539 149** |
| Чистые комиссионные доходы | 25 | 177 585 | 197 191 |
| Чистые расходы по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи | | 491 | - |
| Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте: | | | |
| - торговые операции | | 1 438 521 | 619 454 |
| - переоценка валютных статей | | (891 273) | (656 348) |
| Чистые доходы от операций обратного выкупа и раннего погашения обязательств, выпущенных Банком | | 3 524 | 4 671 |
| Прочие доходы | 26 | 50 936 | 63 303 |
| **Непроцентные доходы** | | **779 784** | **228 271** |
| Расходы на персонал | 27 | (313 198) | (302 173) |
| Амортизация | 12 13 | (49 484) | (51 141) |
| Прочие операционные расходы | 27 | (196 170) | (189 414) |
| Налоги кроме налога на прибыль | | (20 783) | (11 918) |
| Прочие доходы от восстановления резервов | 15 | (74 929) | 26 924 |
| **Непроцентные расходы** | | **(654 564)** | **(527 722)** |
| Убыток по чистой монетарной позиции | | - | (84 560) |
| **Прибыль до расходов по налогу на прибыль** | | **602 543** | **155 138** |
| Расходы по налогу на прибыль | | (119 077) | (46 198) |
| **Прибыль за отчетный год** | | **483 466** | **108 940** |

### Консолидированный отчет о совокупном доходе За год, закончившийся 31 декабря 2015 года

(в миллионах белорусских рублей, если не указано иное)

| | Прим. | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **Прибыль за год** | | **483 466** | **108 940** |
| Переоценка основных средств | | 95 035 | - |
| Влияние налога на прибыль в связи с переоценкой основных средств | | (16 511) | - |
| Влияние изменения ставки налога на прибыль на отложенный налог, признанный в связи с переоценкой зданий | | - | (199) |
| **Чистый прочий совокупный убыток, не подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах** | | **78 524** | **(199)** |
| **Итого совокупный доход за год** | | **561 990** | **108 741** |

### Консолидированный отчет об изменениях в капитале За год, закончившийся 31 декабря 2015 года

(в миллионах белорусских рублей, если не указано иное)

| | Приходится на акционеров Банка | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Уставный капитал | Эмиссионный доход | Нераспределенная прибыль | Фонд переоценки основных средств | Итого капитал |
| **На 31 декабря 2013 г.** | **532 203** | **192 559** | **68 236** | **26 437** | **819 435** |
| Итого совокупный доход за год | - | - | 108 940 | (199) | 108 741 |
| Амортизация фонда переоценки основных средств | - | - | 617 | (617) | - |
| Выпуск акций | 738 790 | - | - | - | 738 790 |
| Дивиденды, выплаченные акционерам Банка | - | - | (116 920) | - | (116 920) |
| **На 31 декабря 2014 г.** | **1 270 993** | **192 559** | **60 873** | **25 621** | **1 550 046** |
| Итого совокупный доход за год | - | - | 483 466 | 78 524 | 561 990 |
| Амортизация фонда переоценки основных средств | - | - | 2 132 | (2 132) | - |
| Выпуск акций | - | - | - | - | - |
| Дивиденды, выплаченные акционерам Банка | - | - | (206 820) | - | (206 820) |
| **На 31 декабря 2015 г.** | **1 270 993** | **192 559** | **339 651** | **102 013** | **1 905 216** |

### Консолидированный отчет о движении денежных средств За год, закончившийся 31 декабря 2015 года

(в миллионах белорусских рублей, если не указано иное)

| | Прим. | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 1 803 564 | 1 349 157 |
| Проценты выплаченные | | (956 110) | (675 556) |
| Комиссии полученные | | 272 694 | 294 820 |
| Комиссии выплаченные | | (70 750) | (89 097) |
| Реализованные доходы за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой | | 2 251 837 | 198 894 |
| Прочие доходы полученные | | 17 151 | 58 432 |
| Расходы на персонал и прочие операционные расходы выплаченные | | (502 603) | (483 703) |
| **Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **2 815 783** | **652 947** |
| *Чистое (увеличение)/уменьшение операционных активов* | | | |
| Средства в кредитных организациях | | (333 804) | 191 618 |
| Кредиты клиентам | | (349 537) | (1 068 232) |
| Прочие активы | | 49 645 | (20 174) |
| *Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств* | | - | |
| Средства НБРБ | | 286 408 | - |
| Средства кредитных организаций | | (2 143 465) | (27 110) |
| Средства клиентов | | 1 704 594 | (470 203) |
| Выпущенные депозитные сертификаты | | (187) | (7 025) |
| Прочие обязательства | | (32 996) | 886 |
| **Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль** | | **1 996 441** | **(747 293)** |
| Уплаченный налог на прибыль | | (12 278) | (53 528) |
| **Чистое поступление/(расходование) денежных средств от операционной деятельности** | | **1 984 163** | **(800 821)** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | | |
| Дивиденды и распределения полученные | | 235 | 359 |
| Покупка инвестиционных ценных бумаг | | (1 900 511) | (404 836) |
| Поступления от продажи и погашения инвестиционных ценных бумаг | | 400 492 | 401 986 |
| Приобретение основных средств | | (53 283) | (37 461) |
| Поступления от реализации основных средств и нематериальных активов | | 2 921 | 4 538 |
| Приобретение нематериальных активов | | (13 943) | (21 575) |
| **Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **(1 564 089)** | **(56 989)** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | | | |
| Поступления от выпуска долговых ценных бумаг | | 474 078 | 317 849 |
| Погашение долговых ценных бумаг | | (290 153) | (257 040) |
| Выплаты по обязательствам по финансовой аренде | | (34 257) | (28 125) |
| Поступления от привлечения субординированных займов | | - | 64 752 |
| Выплаты субординированных займов | | (31 973) | (20 268) |
| Поступления от выпуска акций за вычетом понесенных затрат по сделке | | - | 738 790 |
| Дивиденды, выплаченные акционерам Банка | | (206 820) | (100 602) |
| **Чистое поступление денежных средств от финансовой деятельности** | | **(89 125)** | **715 356** |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | | 299 593 | 50 740 |
| Влияние эффекта инфляции на денежные средства и их эквиваленты | | - | (298 175) |
| **Чистое увеличение/(уменьшение) денежных средств и их эквивалентов** | | **630 542** | **(389 889)** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года** | | **1 221 926** | **1 611 815** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года** | **6** | **1 852 468** | **1 221 926** |

Подписано и утверждено к выпуску от имени руководства Банка

Иванов В.В. Председатель Правления

Дудко М.В. Главный бухгалтер

31 марта 2016 года

EY Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

**Ernst & Young LLC**
Klary Tsetkin Street, 51A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 4242
Fax: +375 (17) 240 4241
www.ey.com/by

**ООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Клары Цеткин, 51А, 15 этаж
Тел.: +375 (17) 240 4242
Факс: +375 (17) 240 4241

### Аудиторское заключение независимой аудиторской организации по консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) за период с 1 января по 31 декабря 2015 года

Председателю Правления
Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь)
Г-ну Иванову В.В.

Акционерам и Совету директоров Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь)

